№ 16 (374) 23 красавіка 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1

Старая і новая «Эўропа»

За два кварталы ад будучай «Эўропы», на вуліцы Інтэрнацыянальнай, бліжэй да Гарадзкога Валу, стаіць пабудаваны паводле праекту Ўладзімера Тарноўскага гатэль з працоўнай назваю «Новая Эўропа». Некаторыя яго элемэнты скапіяваныя з старой «Эўропы». Ужо й ніхто ня памятае, хто ж быў замоўцам гэтае фэшэнэбэльнае будыніны ў прэстыжным квартале сталіцы. Будоўля «завісла», хоць засталося толькі скончыць інтэр'еры й прыбудаваць шкляны гмах у дварах.

старонка 11

Рэнэсанс папулізму

Славаччына ўвойдзе ў Эўразьвяз пад кіраўніцтвам Івана Гашпаравіча. Лешак Мілер пакідае пасаду. Экспрэзыдэнт Паксас мае шанцы вярнуцца ў прэзыдэнцкі палац. У цені Паксаса вырас яшчэ страшнейшы палітык — Віктар Успаскіх.

старонка 4

Палітыкі, вартыя падтрымкі

Адсутнасьць прынцыпаў у палітыка выклікае пытаньні. На чым баку ён гуляе, ці не пачне гуляць супраць сёньняшніх паплечнікаў? У дачыненьні да некалькіх чалавек у стане апазыцыі такіх пытаньняў ніколі не ўзьнікае. Гэта, напрыклад...

старонка 3

Беларусы такія сьціплыя...

...у адрозьненьне ад расейцаў. Гутарка з прафэсарам Макмілінам.

старонка 8

Клінічная сьмерць за тры эўра

...людзі, якія маюць сваякоў у прыгранічнай зоне, вызваляюцца ад выплаты мясцовага збору. Гэта Іван Ломаць і даводзіў кантралёрцы. Аднак тая, нічога ня слухаючы, выпхнула старога чалавека з аўтобуса.

старонка 6

Чыноўнікі палююць

PHOTO.BYMEDIA.NET

Машканская паляўнічая гаспадарка перададзена абутковай фірме «Марка-сэрвіс», Цяцерынская, Браслаўская, Краснапольская адышлі да Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта. Беларусь — краіна шыкоўных лясоў. Аднак паляваць у іх скора змогуць толькі абраныя. Дасьледуе карэспандэнт «НН» — старонка 7.

Інтэлігенцыя перад выбарам(і)

II Усебеларускі сход інтэлігенцыі мае адбыцца 25 красавіка. Арганізатары чакаюць, што кожную вобласьць будуць прадстаўляць 50 дэлегатаў.

Мэтаў сходу некалькі — падрыхтоўка да юрыдычнай рэгістрацыі, абмеркаваньне моўнай праблемы і будучых парлямэнцкіх выбараў. «Наш сход ня мае палітычнага характару, але абмеркаваньне стаўленьня інтэлігенцыі да палітыкі адбудзецца абавязкова. Інтэлігенцыя не павінна быць апалітычнай, інакш яе будуць выкарыстоўваць у сваіх мэтах іншыя», — перакананы мастак Аляксей Марачкін. Сярод іншых праблем на сходзе абмяркуюць нядаўна прынятыя папраўкі ў «Закон аб культуры». На думку мастака, новая рэдакцыя закону ўводзіць дзяржаўную цэнзуру.

Напярэдадні Ўсебеларускага сходу, 22 красавіка а 17-й, у бібліятэцы Дому літаратара адбудзецца сход менскай інтэлігенцыі. А вось месца правядзеньня агульнага сходу 25 красавіка арганізатары пакуль не паведамляюць: баяцца, што ўлады пачнуць перашкаджаць.

Папярэдне абмяркоўваецца і дата трэцяга сходу — канец году. На ім пойдзе гаворка пра прэзыдэнцкія выбары. Марачкін перасьцерагае ад пасьпешлівых высноваў: «Ня трэба думаць, што мы робім сход пад кандыдатуру пэўнай асобы. Мы проста пастараемся вызначыць месца інтэлігенцыі на тых выбарах».

Аркадзь Шанскі

Палута ці Ларыса?

старонка 10



Скарбы Скокаўскага палацу

Там спыняўся Касьцюшка, там жыў прынц Баварскі Леапольд, рыхтаваўся Берасьцейскі мір. Адтуль зьніклі ліст Вашынгтона, карціны ван Дэйка.

старонка 14

Цьвяткоў забараніў «Акупацыю»

Скразны пэрсанаж усіх містэрый — партызанскі ваяка Штыркін у выкананьні Аляксандра Колбышава.

Адкліканая ліцэнзія на мастацкі фільм Андрэя Кудзіненкі «Акупацыя. Містэрыі».

Гэта значыць, што карціну нельга будзе дэманстраваць у Беларусі. Рашэньне аб спыненьні ліцэнзіі прыняў асабіста кіраўнік Дзяржаўнага рэгістру кінавідэапрадукцыі Юры Цьвяткоў. Астатнія сябры камісіі выказаліся супраць. На знак пратэсту пасьля гэтага рашэньня і з прычыны нерэгістрацыі фільму «Рэквіем» пра Васіля Быкава з складу камісіі выйшла кінакрытык Ала Бабкова.

Таленавіты фільм Кудзіненкі адпрэчаны як «не адпаведны рэчаіснасьці». Стужка ня ўпісваецца ў афіцыйны канон вялікай айчыннай: у карціне няма сусальных вобразаў. Усе — людзі, усім трэба выжываць.

Рэжысэр падзеі не камэнтуе. «НН» вернецца да гэтай тэмы.

АШ

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта абыдзецца нашмат таньней, чым купляць ураздроб.

Дык падпісвайся!

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Сьмейцеся па-славянску!

Юбілей Чарлі Чапліна навеяў думку аб тым, што беларусам — апошнім з магіканаў славянства — не хапае арыгінальнай тэорыі сьмеху.

Назіраючы за тым, як у праграмах БТ сьпявалі дыфірамбы Чапліну за ўклад у справу гуманізму, прыгадаў адзін кур'ёз. У 1941 г. у захопленым немцамі Бялградзе кінамэханік, які круціў фільмы для жаўнераў Вэрмахту, сьвядома падмяніў стужку і паказаў ім чаплінскага «Вялікага дыктатара». Спачатку гітлераўцы не маглі зразумець, што адбываецца, а калі зразумелі, кінуліся бегчы хто куды, ахопленыя жахам, што прысутнічаюць на нечым забароненым.

Стаўлю скрыню піва, што той самы эфэкт дэманстрацыя «Дыктатара» выклікала б ва ўдзельнікаў «Дажынак» або Ўсенароднага сходу, заклікананага «адабрамсіць» чарговую карэкціроўку Канстытуцыі. Ніводнага «ха-ха» або «хі-хі» ў глядзельнай залі мы б не пачулі. Паспрабуй потым давесьці ў выканкаме, што кінагрымасы фюрэра Хенкеля выклікалі ў цябе рогат таму, што нагадалі Адольфа Алоізавіча, а ня іншага дыктатара, праўда, не такога й вялікага.

Усё гэта таму, што мы ўспрымаем культуру не з славянскага, а з агульнахворачалавечага пункту гледжаньня. Час патрабуе славянскага Фройда, Лякана, Дэрыды… Напрыклад, тэорыя славянскай сэксуальнасьці можа выглядаць такім чынам: у аснове паводзінаў асобы ляжыць сублімацыя сэксуальных забабонаў, аднак іх крыніцай зьяўляецца не Эдыпаў комплекс любові да маці, а інстынкт любові да прэзыдэнта.

Тое ж тычыцца й славянскай канцэпцыі камічнага.

Згодна з тэорыяй сьмеху, сьмех — гэта афэктыўнае ўзбудженьне ў падсьвядомым пункце, які фіксуе, што прышчэпленая грамадзтвам норма не адпавядае рэальнасьці. Значыць, трэба забараніць узбуджэньне гэтага пункту ў тых выпадках, калі гаворка ідзе пра стэрэатыпы, зьвязаныя з прадстаўнікамі ўлады. У некаторым сэнсе гэта дысцыпліна душы, таму дырэктыва нумар адзін павінна быць дапоўнена пунктам аб дысцыпліне сьмеху.

І што будзе? А вось што. Уявіце калектыўны сход па пытаньні дысцыпліны на фабрыцы. Нечакана замест слайдаў з графікамі росту ВУП і лічбаў, колькі нам вінавата Расея, працоўным дэманструюць «Новыя часы» — фільм, у якім Чаплін высьцёбвае тэйларысцкую мадэль капіталістычнай вытворчасьці. Якая будзе рэакцыя рабацяг на сцэну, дзе заводзкае кіраўніцтва, жадаючы навесьці дысцыпліну, ставіць у цэху робата-карміцеля? Робата, чые мэханічныя рукі кормяць мясам і супам прывязанага Чарлі, а потым у выніку аварыі разам зь мясам піхаюць у рот гайкі, за што Чарлі… звальняюць. Натуральна, гэтая сцэна выклікае ў калектыву выбух працоўнага энтузіязму.

Пакуль што распрацоўка новай схемы славянскай культурнай дэканструкцыі толькі пачынаецца, але часу губляць нельга. Прапаную ва ўсю кінавідэапрадукцыю ўстаўляць 25-ы кадар — «бацька» ў клоўнскім каўпаку на газавай трубе зь велізарнай лустай хлеба, накрытай апэтытнай шкваркай. Пасьля прагляду карціны глядач несьвядома прасякнецца: а) добрым настроем, б) ідэалягічнай ляяльнасьцю, в) цяплом і д) нават будзе адчуваць прыход нейкай сытасьці.

Лёлік Ушкін,
левы радыкал

Тры дні «Таўкачыкаў»

Дзіўна, што ў Беларусі, дзе фольк-мадэрн у такой пашане, дагэтуль не было сталага фэстывалю, які б зьбіраў музыкаў гэтага кірунку. Цяпер на гэты пасад прэтэндуюць «Таўкачыкі». Фэстываль, які пройдзе ў пачатку траўня, будзе другім: першыя «Таўкачыкі» адбыліся ў 2000-м. Рэй вядзе Юры Выдронак, лідэр гурту «Юр'я». Пляны ён мае напалеонаўскія. У Менск зьбяруцца каля дваццаці калектываў, якія прадстаўляюць усе кірункі беларускага фольк-мадэрну.

4 траўня ў Палацы культуры вэтэранаў выступяць акустычныя вакальныя праекты («Кудмень», «Guda», «Яр» і інш.). **5 траўня** ў к/з «Менск» зайграюць музыкі, што спалучаюць фольк з рокам ды электроннай музыкай, — «Палац», «Юр'я», «Бан Жвірба», «Стары Ольса» і інш. Завершыцца фэст **6 траўня** ў Любані (Менская вобласьць). Музыкі з дапамогай мясцовых людзей рэканструююць старажытны абрад «Юр'я», а пасьля сыграюць гала-канцэрт.

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

Рада Эўропы пра Беларусь

Ганеньні на СМІ і разбор справаў зьніклых у Беларусі палітыкаў стануць тэмаю разгляду вясновай сэсіі Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы 28 красавіка.

Папярэджаньне «Intex-press»

Пракурор Баранавічаў Аляксандар Смаль 17 красавіка вынес папярэджаньні галоўнаму рэдактару мясцовага тыднёвіка «Intex-press» Уладзімеру Янукевічу й карэспандэнтцы Марыне Куліковай. Папярэджаньні сталі вынікам скаргі старшыні гарвыканкаму Віктара Дзічкоўскага. Зачапіў яго артыкул Марыны Куліковай пра далучэньне сяброў БРСМ на чале зь Міколам Сасімам да «Зубра». Журналісты лічаць папярэджаньні неабгрунтаванымі і будуць іх абскарджваць. «Intex-press» — адна з самых пасьпяховых незалежных газэтаў.

Радаўніца: 2 мільёны

У Дзень памінаньня могілкі наведалі больш за 1,95 млн чалавек. Гэта ацэнкі МУС.

Ліквідаваны БАМП

Ліквідаваная чарговая грамадзкая арганізацыя — Беларускае аб'яднаньне маладых палітыкаў. Яна існавала з 1992 г. Зь вясны мінулага году суды розных узроўняў на просьбу Мінюсту ліквідавалі 54 грамадзкія арганізацыі.

ЗША ў Іраку: найбольшае пасольства

Колькасьць забітых вайскоўцаў ЗША ў Іраку дайшла да 511 чалавек, паведаміў Пэнтагон. Гішпанія, Дамінікана й Гандурас выводзяць свае войскі з Іраку, гэтага ж патрабуе ўкраінская апазыцыя. А італьянскі прэм'ер Бэрлюсконі заявіў: калі вывесьці войскі, у Іраку пачнецца хаос. Ня мае намеру выводзіць войскі і Польшча. Амэрыканцы ж маюць павялічыць штат пасольства ў Багдадзе да 3000 чалавек, зь іх каля 1000 грамадзянаў ЗША, паведаміла газэта «Аш-Шарк Аль-Аўсат». Гэта зрабіла б зь яго найбольшае дыпрадстаўніцтва ЗША ў сьвеце. У Беларусі штат пасольства ЗША складае 25 чалавек.

Сэкс у казармах

Нямецкі Бундэсвэр мае зьняць забарону на занятак сэксам у кашарах як састарэлую, заявіў у сераду прэсавы сакратар Міністэрства абароны. Калі абое партнэры служаць у войску, сэкс на тэрыторыі вайсковых аб'ектаў не павінен забараняцца. «Партнэрскія сувязі на вайсковых аб'ектах» і супольнае пражываньне ў казармах будуць дазволеныя. Бундэсвэр налічвае 270 тыс. жаўнераў, у тым ліку 9850 жанчынаў.

МБ; БелаПАН

«Свабода» ў Сеціве

Газэта «Свабода», першы выпуск якой зьявіўся 25 сакавіка, цяпер ёсьць і ў Інтэрнэце. Прачытаць матэрыялы нумару можна ў фармаце pdf. Сувязь з стваральнікамі газэты — праз электронную пошту (hazeta@tut.by).

Чарнобыльскі шлях'2004

Ганаровым старшынём аргкамітэту «Чарнобыльскага шляху'2004» абраны прафэсар Іван Нікітчанка. Збор удзельнікаў акцыі 26 красавіка папярэдне прызначаны на пл.Якуба Коласа а 18.30.

У антракце

Віталь Тарас

PHOTO.BYMEDIA.NET

Ёсьць даволі пашыраны псыхалягічны тып. Людзі пэўнага кшталту нізавошта не паверацъ у тое, што нехта зь іхных сваякоў, аднакашнікаў ці суседзяў дасягнуў посьпеху. Вядомы клясычны прыклад. Адна жанчына, якой сказалі, што яе даўні знаёмы, літаратар Н., атрымаў Нобэлеўскую прэмію, усклікнула: «Хто? Гэты ёлупень, гэты небарака, гэты абібок?! Кіньце, не сьмяшыце мяне!»

Падобны сындром, на жаль, пашыраны ня толькі сярод людзей, ён уласьцівы й грамадзкім супольнасьцям. Беларусы, напрыклад, гатовыя ганарыцца Давыдам Гарадзенскім, вялікім князем Вітаўтам, Лявом Сапегам — адным словам, героямі мінулага, пра якіх яны амаль нічога ня ведаюць. Яны могуць ганарыцца таксама сучаснікамі Мірным або Ваўчковым. Таму што тыя займаюцца справай, якая далёка ня кожнаму па плячы ды й па кішэні, — тэнісам. Калі ж размова заходзіць пра сучасных палітыкаў…

Вядома, ёсьць некалькі рэчаў, у якіх разьбіраецца кожны, — гэта футбол, мэдыцына й палітыка. Але беларуская палітыка — гэта такая спэцыфічная рэч, у якой мала хто разьбіраецца нават сярод прафэсіяналаў, ды амаль ніхто й ня хоча разьбірацца. Найперш праз тое, што, дзяржаўныя СМІ стварылі адпаведны вобраз палітыкаў, якія ўвесь час блытаюцца пад нагамі ва ўладаў (чытай — у Лукашэнкі, які заўсёды, натуральна, па-над палітыкаю), пэрыядычна выступаюць зь нейкімі забаўнымі й незразумелымі заявамі ў варожых Беларусі СМІ — напрыклад расейскіх. Пры гэтым жывуць яны на нейкія чужыя гранты, езьдзяць па Эўропах, а ў вольны час прымусова вучаць сваіх і чужых дзяцей нейкай старарэжымнай беларускай мове.

Гэта, зразумела, карыкатура, якую спрабуюць навязаць грамадзтву ў якасьці стэрэатыпу. Дарэчы, навязваньне адбываецца досыць пасьпяхова, бо чым больш прымітыўны вобраз, тым лягчэй ён запамінаецца. Гэта як вобраз беларускага паліцая зь бел-чырвона-белай стужкай на рукаве ці вобраз габрэя з крывым носам і такім самым крывым дулам пісталета, зь якога можна цаляць у мірных грамадзянаў з завугольля. (Паміж іншым, часам самая буйная фантазія ці кашмар прапагандыста-карыкатурыста ажыцьцяўляецца. Нядаўна ў прэсе зьявіліся паведамленьні пра тое, што ізраільскія інжынэры сканструявалі адмысловы прыцэл да аўтамата, які дазваляе, дзякуючы дзівосам оптыкі, страляць з-за рогу).

Не нашмат больш складаныя стэрэатыпы выпрацаваны за апошнія дзесяць гадоў на старонках недзяржаўных выданьняў. Памятаеце такую дзіцячую гульню ў савецкай школе: птушка — курыца, паэт — Пушкін, рака — Волга. Так і сёньня. Апазыцыя — слабая. Дзяржава — моцная. Альтэрнатывы — няма.

Часам зьяўляюцца новыя штампы, якія выглядаюць, зрэшты, ня меней зацёртымі, чымся старыя. Напрыклад, назву кааліцыі «Пяць плюс» параўноўваюць са сродкам ад тараканаў. Гаворка тут не пра саму назву і не пра вартасьці або недахопы Народнай кааліцыі. Размова ідзе аб прынцыпе: дастаткова начапіць ярлык на апанэнта — і ты на кані ды яшчэ ў капелюшы, а твой праціўнік кешкаецца недзе там, у брудзе.

Дарэчы, традыцыю наклейваньня ярлыкоў на дэмакратычных палітыкаў у дэмакратычным жа друку закладваў (ці пазычыў яе ў расейскіх журналістаў) вядомы публіцыст Аляксандар Фядута, які назваў Вінцука Вячорку «хлопчыкам са старэчым тварам». Што з таго, што бульварна-прагрэсіўныя «Навінкі» потым зьдзекаваліся зь Філа Дутага. Ёсьць такая расейская прымаўка, прыдуманая нібыта адмыслова для журналістаў адмысловай пароды: «Брань на вороту не виснет».

Дык выходзіць — што нашаму брату-журналісту здорава, тое палітыку сьмерць? Тут вось якая рэч. Палітык, пакуль ён карыстаецца толькі друкаваным словам, а значыць, выступае ў ролі партыйнага публіцыста, заўсёды журналісту прайграе. Бо адсутнасьць прынцыпаў у журналіста (пэўнага кшталту) часам дапамагае выплыць. Некалі Генры Форд казаў: «Сумленны журналіст прадаецца толькі аднойчы». З таго часу сумленнасьці ў журналісцкай прафэсіі наўрад ці пабольшала.

Адсутнасьць жа прынцыпаў у палітыка выклікае пытаньні, у тым ліку ў журналістаў. Прынамсі, такія: а на чыім баку ён гуляе, ці не выпадкова патрапіў у стан апазыцыі, і, калі абставіны зьменяцца, ці не пачне ён гуляць супраць сваіх сёньняшніх паплечнікаў?

Дык вось, у дачыненьні прынамсі да некалькіх чалавек у стане апазыцыі такіх пытаньняў ніколі не ўзьнікае. Гэта, напрыклад, Вячорка, Івашкевіч, Беленькі, Шушкевіч, Лябедзька, Дабравольскі… Я наўмысна называю людзей (прычым людзей найбольш вядомых) з розных палітычных партый, якія часам варагуюць адна з адной. Палітычныя разыходжаньні тут ня маюць значэньня.

- Вартыя нашай падтрымкі палітыкі, якія здолелі выжыць у непрыдатных умовах і пры гэтым ня здрадзіць сваім прынцыпам.

Галоўнае, што адрозьнівае палітыка ад непалітыка, — гэта дзеяньне. Яшчэ раз паўтаруся. Можна колькі хочаш весьці дыскусію на старонках прэсы з уладамі, палітычнымі апанэнтамі ці журналістамі — і такая дыскусія часам жыцьцёва патрэбная, — але палітык не павінен ператварацца ў журналіста, хай сабе ленінскай школы. Грамадзтва (у тым ліку й СМІ) чакае ад палітыка дзеяньняў. Калі паважаны Зянон Пазьняк выступіў зь лёзунгам «Палітык не павінен сядзець у турме», ён выступіў у дадзеным выпадку як журналіст, вонкавы назіральнік. А Хадыка і Сіўчык, якія трымалі тады галадоўку ў вязьніцы, былі акторамі (слова «актор» у палітыцы, як і ў тэатры, дарэчы, паходзіць ад слова «акт» — дзеяньне). Вельмі хацелася б спадзявацца, што вядомы ўсім Акт аб дэмакратыі паслужыць штуршком менавіта да дзеяньняў у Беларусі, а не да чарговых размоў аб ёй.

Быць акторам — значыць заставацца на палітычнай сцэне. І ня ў ролі статыста. А ў ролі героя. Які там герой — станоўчы, адмоўны ці, як было некалі модна казаць, амбівалентны — гэта хай вырашае публіка. А яшчэ лепей — час. Вядомы тэатральны прынцып «тут і цяпер», як ні дзіўна, вельмі дарэчны і ў палітыцы.

Можна даць вялікае інтэрвію паважанаму журналісту, можна даручыць яму напісаць нарыс пра сябе, можна рэгулярна ўдзельнічаць у «круглых сталах». А можна выступіць па тэлебачаньні з крытыкай першай асобы ў дзяржаве (так, і слова можа быць справай!). Альбо паўтары гадзіны даводзіць начальніку якога-небудзь Слонімскага РУУС, што нельга парушаць канстытуцыйнае права выбаршчыкаў на сустрэчу з палітыкамі. І тым самым ня проста займацца сваёй непасрэднай справай, але быць тым, што называецца прыгожым замежным словам «ньюсмэйкер».

Колькі ў палітыка сабак і якой яны пароды альбо колькі ў яго каханак — гэта цікава абываццелю хіба тады, калі гэты самы палітык ужо стаў знакамітасьцю. Ніякая піяркампанія не дапаможа, калі няма суб'екта.

Кажуць — паглядзіце на апазыцыю, там жа шмат гадоў «сьвецяцца» адны й тыя людзі, яны праваліліся, яны нічога ня могуць, трэба іх мяняць. У гэтым ёсьць, паклаўшы руку на сэрца, няшчырасьць. Яны праваліліся, таму што мы, выбаршчыкі, кепска іх падтрымалі. У нас што, былі ці ёсьць у запасе нейкія іншыя, лепшыя кандыдаты? Калі так, чаму ніхто ніколі пра іх ня чуў? Хіба што яны жывуць на Марсе?

Уменьне выжыць для палітыка ў самых непрыдатных умовах — ня самая дрэнная якасьць. Той, хто кажа, што парлямэнцкія выбары важнейшыя за прэзыдэнцкія, на мой погляд, мае рацыю. Але калі заклікаюць пры гэтым галасаваць за «арыстакратаў духу» — у мяне асабіста таксама ўзьнікаюць пэўныя сумненьні. Ці патрапляюць пад азначэньне арыстакратаў тыя ж Лябедзька зь Вячоркам або яны ростам ня выйшлі?

Арыстакратыя, безумоўна, найлепшы від праўленьня, які ведае гісторыя. Але тая ж гісторыя сьведчыць, што занадта часта арыстакраты грэбавалі сваім правам і абавязкам засядаць у сэнаце. Яны лічылі палітыку — і, мабыць, слушна — недастаткова высакародным занятакам, пакідаючы яе народным трыбунам — людзям, мякка кажучы, далёка не бязгрэшным. Можа, усё ж і нам, выбарцам, варта пакінуць палітыку палітыкам. Пры ўмове што яны будуць займацца ёю сумленна й прафэсійна, а мы ня будзем грэбаваць сваім абавязкам галасаваць на выбарах.

Папулісцкі

Славаччына ўвойдзе ў Эўразьвяз пад кіраўніцтвам Івана Гашпаравіча. Лешак Мілер, які інтэграваў Польшчу ў Эўропу, пакіне пасаду адразу пасьля 1 траўня. А экс-прэзыдэнт Паксас мае шанцы вярнуцца ў былы губэрнатарскі палац у Вільні. Гісторыя Цэнтральнай Эўропы ня скончылася.

Аднойчы ў аўтобусе Вільня—Менск мне давялося назіраць цікавую спрэчку. На пад'езьдзе да Ашмяны пасажыр-літовец задуменна прамовіў: малайчына Лукашэнка, усе палеткі да апошняга лапіка засеяныя, ня тое што ў нас у Літве, дзе даўно ўжо загоны зарасьлі гуголлем. На гэта азваліся, ня выцерпелі двое маладых беларусаў, схіленых над сваімі ноўтбукамі. Яны даказвалі, што гэта паказуха, што насамрэч палі засяваюцца занадта дарагім коштам, што беларуская сельская гаспадарка ў жудасным стане і Беларусь вымушаная імпартаваць збожжа зь Літвы, што Літва, нягледзячы на цяжкасьці рэфармаваньня, увайшла ў Эўразьвяз, а гэта для эканомікі важней за севаабарот... Дарма, іх аргумэнты падалі на камень. Палеміка, нібы агонь па сухой траве, распаўзлася па ўсім аўтобусе — большасьць узяла бок жмудзіна. Ён, дарэчы, быў не маргінал які, а бізнэсовец, што кіраваўся ў Львоў закупаць шчэбень.

Калі прарасейская партыя «За правы чалавека ў адзінай Латвіі» (ЗаПЧАЛ) атрымала на выбарах у латвійскі Сойм чвэрць галасоў, гэта ня выклікала вялікай рэакцыі ў Эўропе, бо ЗаПЧАЛ засталася ў парлямэнце ў поўнай ізаляцыі. Аднак калі ўлічыць, што сымпатыі так званых «неграмадзян», якіх у Латвіі каля 30%, якраз татальна з ЗаПЧАЛ, дык робіцца зразумелым, што праз 13 гадоў пасьля атрыманьня незалежнасьці і па далучэньні краіны да NATO і Эўразьвязу большасьць выбарцаў застаецца ў вялікай меры расейскаарыентаванай, непрыхільнай да рэформаў і поўнай недаверу да палітычнае эліты, сфармаванай за гэтае дзесяцігодзьдзе паводле амэрыканскіх тэхналёгіяў. Самае прыкрае для палітыкаў, што ЗаПЧАЛ падтрымліваюць ня толькі «няверныя» нацыянальныя меншасьці, але й нямала карэнных латышоў.

Латвійскую палітычную эліту пэрыядычна скаланаюць скандалы. Андрыс Шкеле мусіў сысьці з пасады прэм'ера пасьля абвінавачаньня шэрагу высокіх чыноўнікаў у пэдафіліі — так і не даказанага, зрэшты. Эйнар Рэпшэ зарабіў сабе рэпутацыю як творца латвійскае фінансавае сыстэмы і шматгадовы кіраўнік Цэнтральнага банку. Ягоная правацэнтрысцкая партыя лёгка выйграла выбары, але праз лічаныя месяцы і ён мусіў адправіцца ў адстаўку праз скандал з набыцьцём зямельных пляцаў.

Паводле меркаваньня многіх латвійскіх палітолягаў, абодва палітычныя крызысы ў Латвіі былі штучна справакаваныя расейскімі СМІ. Расея пакуль ня мае магчымасьці прывесьці да ўлады ў Рызе прыхільных для сябе палітыкаў. Аднак яна дэманструе латвійскай эліце сваю неабмежаваную здольнасьць уплываць на ўнутраныя справы. І намякае: паслуга за паслугу.

Становішча ў Латвіі мо найбольш няпэўнае сярод усіх краінаў рэгіёну праз вялікую долю расейскага на культуры насельніцтва, значную прысутнасьць расейскага капіталу над Дзьвіной-Даўгавай і транзытны характар латвійскай эканомікі.

Ажно і ў Літве ледзь толькі пазбыліся папуліста Паксаса, як на перамогу на выбарах прэтэндуе іншы цудатворца — Успаскіх і ягоная псэўдалейбарысцкая партыя. Вырашальнаю стане ня столькі прэзыдэнцкая, колькі восеньская парлямэнцкая кампанія, бо Літва — рэспубліка парлямэнцкая. Папулярным лідэрам застаецца вэтэран літоўскай палітыкі, экс-прэзыдэнт, а яшчэ раней лідэр кампартыі Альгірдас Бразаўскас. Але і ён ня можа пахваліцца ранейшай масавай падтрымкай у каталіцкай краіне пасьля ня дужа прыемнай гісторыі з разводам і новым шлюбам.

У адрозьненьне ад балтыйскіх калегаў, лідэр польскіх левых папулістаў Анджэй Лепэр — безнадзейны маргінал у палітыцы і ня мае апірышча ў бізнэс-колах. У палітычных колаў сапраўдны шок выклікала тое, што ў Польшчы, гэтым бастыёне каталіцызму і калысцы антыкамунізму, значная частка грамадзтва гатовая падтрымаць ня проста перакаванага посткамуніста, а адкрытага русафіла і антырыначніка. «Маладая польская дэмакратыя апынулася ў найцяжэйшай сытуацыі ад часу свайго нараджэньня, — піша папулярны польскі камэнтатар Томаш Ліс. — Ці не паўторыцца ў Польшчы Аргентына?» — пытаецца ён.

«Самаабарона» на чале з хамаватым Анджэем Лепэрам абышла ня толькі дыскрэдытаваных трыма гадамі кіраваньня посткамуністаў, але і змагаецца за лідэрства ў рэйтынгах з правацэнтрысцкай Грамадзянскай плятформай Яна Ракіты.

У польскім выпадку грамадзтва не давярае не асобным партыям, а палітычнай эліце ў цэлым, — нешта падобнае ўжо доўгі час назіраецца ў Беларусі і ў многіх іншых краінах рэгіёну. Гэта стварае глебу для харызматычных лідэраў, якія падаюць сябе як чужыя істэблішмэнту.

Пасьпешлівыя спробы прэзыдэнта Квасьнеўскага вярнуць давер выбарцаў да палітыкаў пакуль не далі вынікаў. Абвешчаная адстаўка прэм'ера Мілера, стварэньне новай партыі «Сацыял-дэмакратыя Польшчы» на чале з экс-маршалкам Сойму Маркам Бароўскім нязначна палепшылі каціроўкі левых. Міністар фінансаў Марэк Бэлька і экс-прэм'ер Юзаф Алексы спрабуюць уратаваць урад.

Партыі — акушэркі новай Польшчы — або зьніклі, або стаяць на мяжы зьнікненьня. Няма болей на палітычнай сцэне Уніі Свабоды, няма Выбарчае Акцыі «Салідарнасьць». Здаецца, пасьля наступных выбараў не застанецца й Саюзу левых дэмакратаў і нават Сялянскае партыі зь яе стогадовай традыцыяй. Вядома, што насельніцтву не падабаецца найбольш: палітыкі ўтвараюць замкнёную касту, якая больш цікавіцца сабой, чым людзьмі. Капіталізм застаецца палітычным. Рынак па-ранейшаму кантралююць дзяржава й палітыкі. Адна афэра зьмяняе другую.

Лепэр — кумір strefy biady, войска беспрацоўных, якіх у Польшчы больш за 19%. Людзей, што не знаходзяць сябе ў «дзіўным новым сьвеце».

Беспрацоўе стымулюе людзей лепш працаваць, каб ня страціць працы. Гэта дабро для эканомікі, але драма для тых, хто вымушаны бадзяцца бяз справы. І Лепэр гуляе на нянавісьці галоты да польскага Чубайса — Лешака Бальцаровіча. «У турму яго!» — лямантуе Лепэр. З правага, нацыянальна-каталіцкага флянгу старую палітычную эліту ціснуць фундамэнталісты-каталікі зь Лігі польскіх сем'яў.

Сцэмэнтаваныя ў 90-я палітычныя эліты найбольш дыскрэдытуюць сябе няздольнасьцю пакараць вінаватых у карупцыйных справах. Шматмесячны разбор «афэры Рывіна» скончыўся нічым.

Рывін, бізнэсовец расейскага паходжаньня, выманьваў з «Gazety Wyborczej» хабар: за 17 млн даляраў ён абяцаў правесьці праз парлямэнт закон, паводле якога газэты мелі б права набываць тэлеканалы (цяпер гэта забаронена польскім заканадаўствам, каб не ўтвараліся манаполіі на рынку СМІ). Прапанова выйшла на сьвятло, выбухнуў скандал. Вынік сьмеху варты: сьледзтва прыйшло да высновы, што Рывін... дзейнічаў з уласнай ініцыятывы. Цяпер ягоныя адвакаты дэкляруюць у судзе: «Сам Рывін таксама тройчы не вінаваты». Ніхто не вінаваты.

Расейскія паходжаньне і повязі значнай часткі палітычна-бізнэсовых прайдзісьветаў з краінаў цэнтру Эўропы выклікаюць падазрэньні: а ці не стаяць за гэтымі махлярамі іншыя маніпулятары, чыя мэта — нават ня столькі асабістае ўзбагачэньне, колькі дыскрэдытацыя цяперашніх праамэрыканскіх рэжымаў і дэстабілізацыя сытуацыі ў новых сябрах Эўразьвязу ды NATO? Да такой «тэорыі змовы», якой фантастычнай яна ні падаецца, схіляюцца ўжо многія палітычныя аналітыкі ў суседняй з намі Літве.

Усе папулісцкія і антымадэрнісцкія партыі, кшталту «Самаабароны», ня маюць ні сур'ёзнае плятформы, ні добрае стратэгіі. Іх экс-цэнтрычных лідэраў яднае толькі падабенства рыторыкі. Лепэр у мінулую сераду ў інтэрвію газэце «Życie Warszawy» пахваліў Гітлера за ўменьне ліквідаваць беспрацоўе і вырашаць эканамічныя праблемы краіны. Вам гэта нікога не нагадвае? Шанцаў на перамогу ў Лепэра няшмат, лібэралы нават радыя, што на палітычнай сцэне ёсьць такое «пудзіла». Як паказвае досьвед Жырыноўскага ў Расеі, такія палітычкі здольныя выжываць гадамі і нават дыктаваць моду. І тое — бяз шкоды для ўлады. Бо палітычныя апанэнты «Самаабароны» — «традыцыйныя» левыя, прадстаўнікі цэнтру і правыя — маюць салідныя апоры на Захадзе, у Касьцёле, бізнэсе.

Адрозьненьне славацкіх папулістаў ад Лепэра ў тым, што папуліст Ўладзімер Мечыяр і нацыяналіст Іван Гашпаравіч, канкурэнты на апошніх выбарах, якраз паходзяць з высокае намэнклятуры і цесна зьвязаны з уплывовымі прамыслоўцамі. Мечыяра называюць славацкім Лукашэнкам, як і Лепэра — польскім Лукашэнкам.

У першым туры прэзыдэнцкіх выбараў Мечыяр набраў 34% галасоў, ягоны былы паплечнік Іван Гашпаравіч — 23%. Абодва яны абышлі дзейнага міністра замежных справаў Эдуарда Кукана, хрысьціянскага дэмакрата, якога падтрымлівала ўрадавая кааліцыя.

Ад прэзыдэнта ў Браціславе мала што залежыць: Славаччына — парлямэнцкая рэспубліка, — але само вяртаньне ў Замак над Дунаем прадстаўніка палітычных сілаў, у перамогу над якімі Эўропа і ЗША шэсьць гадоў таму ўклалі столькі сілаў і сродкаў, уражвае. Між тым выбары прайшлі пры поўнай апатыі. Да скрыняў прыйшло толькі 43% выбарцаў, надзеленых правам голасу.

У Сэрбіі выбары прэзыдэнта адбудуцца ў чэрвені, дзякуючы таму, што парлямэнт нарэшце скасаваў 50-працэнтавую норму ўдзелу ў выбарах, якая раней была неабходная, каб прызнаць галасаваньне сапраўдным. Дзьве папярэднія спробы абраць прэзыдэнта ня мелі посьпеху. Галоўнымі прэтэндэнтамі на чэрвеньскіх выбарах лічацца лідэр радыкалаў Нікаліч і паплечнік прэм'ера Каштуніцы Маркічанін. Абодва нацыяналісты. Тым часам героі апазыцыі 90-х і рэвалюцыі 2000 г. паўтараюць лёс першых скрыпак польскае палітычнае сцэны 90-х.

Сярод гэтых палітыкаў выдзяляюцца тры дамінантныя тыпы. Адны — спрытнюгі, якія пасьпяшаліся канвэртаваць прыход да ўлады ў капітал грашовы. Другія — добрыя хлопцы і аматары мастацтваў. Аднак, як аказалася, мала быць доб-

REUTERS

Уладзімер Мечыяр, на адхіленьне якога ад улады шэсьць гадоў таму Захад паклаў столькі сілаў і сродкаў, застаецца ў палітыцы.

EUROPA.EU.INT

Зьмяніўшы адзін заручальны пярсьцёнак на другі, Альгірдас Бразаўскас страціў падтрымку выбаршчыкаў.

REUTERS

Анджэй Лепэр: «Гітлер файна даваў рады беспрацоўю!»

рэнэсанс

рым хлопцам. Каб тваю працу куплялі выбарцы, яна мусіць быць прафэсійнаю і эфэктыўнаю. І спрытнюг, і добрых хлопцаў выбарцы адкінулі. Генатып жа дзеячоў кампэтэнтных і сумленных проста расчыніўся ў першай пасьлярэвалюцыйнай хвалі.

Тое самае 10 гадоў таму адбывалася з многімі цэнтральнаэўрапейскімі краінамі. Дакладней, пачало адбывацца. Тады мала хто чакаў, што палітычная нестабільнасьць, урадавая чахарда зацягнуцца на дзесяцігодзьдзе і пры першым зьніжэньні ўвагі да цэнтральнаэўрапейскага рэгіёну з боку ЗША — а гэта здарылася, калі амэрыканцы загрузьлі ў Іраку, — папулісты зноў узьнімуць галаву. Гэтыя папулісты эксплюатуюць прарасейскія і сацыялістычныя настроі. А Расея — што ня менш паказальна — эксплюатуе папулістаў.

Дзесяць гадоў Беларусь была поўным выключэньнем з правіла. Адам Міхнік пісаў пра «выпадзеньне Беларусі», якое ўскладніла сытуацыю ў постсавецкай Эўропе. Цяпер наша краіна глядзіцца хутчэй першай ластаўкай агульнай тэндэнцыі. Сярод Успаскіх і Гашпаравічаў кіраўнікі беларускай адміністрацыі ня будуць чужымі. Паказальна, наколькі апэратыўна беларуская прэзыдэнтура павіншавала новага кіраўніка Славаччыны з абраньнем.

Як паказваюць выпадкі Лепэра й Паксаса, у Цэнтральнай Эўропе застаецца нямала русафілаў. Прынамсі, ня меней, чым іх было ў той самай strefie biady пасьля другой сусьветнай, калі гэты рэгіён трапіў пад уплыў Савецкага Саюзу. Справа бярэцца ня столькі з умяшаньня Расеі ў цэнтральнаэўрапейскія палітычныя гульні, колькі зь нясьпеласьці, некампэтэнтнасьці палітычнае клясы. «Палітыкаў, якія не разумеюць, што палітыка — гэта служэньне, урэшце выганяць з пасадаў людзі, якіх гэтыя палітыкі лічаць халопамі», — піша згаданы вышэй Томаш Ліс.

Хвароба навідавоку. Яна — у той маральнай карупцыі, якою разбэсьціла палітычныя эліты магчымасьць узбагачэньня. Яна таксама ў нязьдольнасьці інтэлектуалаў знайсьці новую нацыянальную ідэю, іншыя маральныя імпэратывы ва ўмовах, калі старыя ідэалы нацыянальнага вызваленьня, вяртаньня да колішніх вартасьцяў і эўрапейскага пакліканьня рэалізаваліся і больш не натхняюць. Нешта такое пранізала й беларускія дэмакратычныя эліты на зломе стагодзьдзяў, толькі пры адсутнасьці дэмакратычнай канкурэнцыі ў Беларусі самаачышчэньне неапраўдана зацягнулася. Тады як у Польшчы Лепэр, а ў Літве Паксас ачышчэньне каталізавалі.

Той літоўскі бізнэсовец, які хваліў беларускія нівы, эмацыйна пазайздросьціў уяўнаму парадку, які забясьпечвае ў Беларусі «моцная рука». Палітыкі таму й называюцца папулістамі, што ўмеюць іграць на публіку, нават засеянымі калгаснаю цаною палеткамі. Аднак адрозьненьне цэнтральнаэўрапейскага выбарцы ад беларускага ў тым, што галасуе ён урэшце за вартасьці, а не на эмоцыях. Не за мясцовага Лукашэнку.

Новыя цэнтральнаэўрапейскія папулісты ня маюць шанцаў на перамогу. Маральная большасьць грамадзтва іх баіцца. У другім туры выбараў у Славаччыне Гашпаравіч сабраў 60% галасоў толькі таму, што людзі выбіралі яго як меншае зло ў параўнаньні зь Мечыярам.

Палітыкі-папулісты вучаць традыцыйных палітыкаў уменьню і патрэбе змагацца за выбарцаў і гаварыць на зразумелай для вуліцы мове.

Палітычны крызыс, які перажываюць краіны Цэнтральнай Эўропы, — працэс непазьбежны і нават па-свойму здаровы. Як здаровая рэакцыя арганізму — гарачка ў адказ на пранікненьне вірусаў, так і маладыя дэмакратыі трасе ад пранікненьня вірусаў карупцыі. Дэмакратыя — гэта самарэгуляваная сыстэма, пры якой маюць вагу інтарэсы людзей, і супольнасьцяў, і групаў уплыву, і розумаў, і капіталаў. У тым ліку і злых розумаў, і расчараваных супольнасьцяў, і брудных капіталаў. Нічога не паробіш. Сярэдняе арытмэтычнае ўсё адно выходзіць адзіным магчымым. А лепшае за дэмакратыю сыстэмы, як ні банальна гэта гучыць, яшчэ не прыдумана.



AP

Новага прэзыдэнта Славаччыны Івана Гашпаравіча падтрымлівалі нацыяналісты й радыкалы

Мікола Бугай

Літва пад далоньню Расеі

Пасьля імпічмэнту прэзыдэнта Раландаса Паксаса ў літоўскіх палітычных элітаў па-ранейшаму пануе трывога. На думку многіх палітолягаў, адбітая асобная атака, але пагроза ўплыву Крамля на палітычны і асабліва эканамічны курс краіны па-ранейшаму рэальная. Новы пострах літоўскае палітыкі — Віктар Успаскіх, расеец зь літоўскім грамадзянствам, мільянэр, лідэр папулісцкай Партыі працы, які абяцае адстойваць інтарэсы «працоўных масаў». Партыя была створаная паўгоду таму, але ўжо цяпер налічвае ў сваіх шэрагах 7 тысячаў сяброў і карыстаецца падтрымкай 25% насельніцтва.

«Вялікая частка грамадзтва і цяпер яшчэ марыць пра новага мэсію, які накорміць і адзене. А гэта значыць, што Літве, якая толькі што мела справу з плянам А, створаным у лябірынтах маскоўскай выведкі, адразу давядзецца сутыкнуцца і з плянам Б — Віктарам Успаскіх», — піша Рымвідас Валатка, уплывовы камэнтатар найбуйнейшай газэты «Lietuvos Rytas». Ні ў кога няма сумневаў, што менавіта Ўспаскіх атрымаў найбольшыя дывідэнды ад «паксасгейту».

На Паксаса забыліся. Раней хваляваліся, як бы перакрыць гэтаму лётчыку-авантурысту дарогу да паўторнага ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах. Плянавалася прыцягнуць Паксаса да крымінальнай адказнасьці за раскрыцьцё дзяржаўнай таямніцы, што зрабіла б яго паўторнае балятаваньне на выбарах немагчымым. Аднак цяпер пракуратура не выстаўляе яму ніякіх абвінавачаньняў. Хоча толькі заслухаць яго як сьведку ў справе ўцечак сакрэтнай інфармацыі ў СМІ падчас ягонага кіраваньня. «Кіраўніцтву бракуе палітычнай волі, каб пасадзіць Паксаса за краты. Пракуроры чакаюць больш выразных знакаў», — кажуць літоўскія журналісты.

Віктар Успаскіх зрабіўся для літоўскага істэблішмэнту ворагам нумар адзін. Палітычныя эліты лічаць, што цяпер Паксас не такі небясьпечны, як Успаскіх.

«Успаскіх ex machina»

Успаскіх прыехаў у Літву ў сярэдзіне 80-х і працаваў зваршчыкам на будаўніцтве літоўскага адрэзку газаправоду да партоў Балтыкі. Пасьля аддзяленьня Літвы ад СССР на гандлі паміж Літвой і Расеяй ён зарабіў свае першыя вялікія грошы. Потым, дзякуючы старым знаёмствам, увайшоў у ласку шэфаў «Газпраму», зрабіўся адным з галоўных пасярэднікаў — прадаўцоў расейскага газу ў Літве і зарабіў на гэтым мільёны. Сёньня свой капітал Успаскіх ацэньвае прыблізна ў 70 млн даляраў.

Калі ў 2000 г. яго выбралі ў Сойм, ён прадаў акцыі кампаніі, якія гандлююць газам, і абвясьціў, што з гэтага часу ня мае нічога супольнага з «Газпрамам». Сёньня Ўспаскіх ужо нават ня хоча размаўляць па-расейску, толькі па-літоўску, але гадзіньнік на ягоным пісьмовым стале ўсё яшчэ паказвае маскоўскі, а ня віленскі час.

Што прапануе Ўспаскіх выбаршчыкам? «Усё, чаго яны пажадаюць, — лічыць Андрус Бачыуліс, камэнтатар тыднёвіка «Veidas». — Ён кляне Сойм, урад і іншыя дзяржаўныя інстытуты. Тлумачыць, што за 14 гадоў незалежнасьці ў Літве практычна нічога добрага не было зроблена, і абяцае людзям, што, прыйшоўшы да ўлады, адразу расправіцца з карупцыяй (пры гэтым заменіць тысячу найважнейшых чыноўнікаў), павялічыць пэнсіі (сродкі, маўляў, ёсьць, толькі трэба іх іначай падзяліць), створыць высокааплатныя працоўныя месцы (пара пакончыць зь дзікім капіталізмам!)».

На нядаўнім зьезьдзе сваёй партыі абвясьціў, што праз 1111 дзён пасьля выбараў, якія ён выйграе, у Літве запануе проста рай. І выбаршчыкі ўсё больш і больш яму вераць. І ня толькі расчараваныя пераменамі прыхільнікі зьнятага Паксаса, але — як паказваюць сацыялягічныя апытаньні — таксама прыхільнікі левых і цэнтрыстаў. Цяпер Партыя працы перагнала ўсе астатнія палітычныя сілы і карыстаецца амаль 25-працэнтнай падтрымкай насельніцтва. Другая па папулярнасьці сацыял-дэмакратычная партыя ня мае і 15%. І гэта нават не паварушыўшы пальцам! (Так напісалі біскупы Касьцёлу ў спэцыяльнай душпастырскай адозьве, у якой яны перасьцерагаюць вернікаў перад Успаскіх і ягонай партыяй ды заклікаюць не галасаваць за яе. Успаскіх пабойваецца і вялікая частка інтэлектуалаў).

Паляваньне на аўтарытэты

Успаскіх разумее: абапіраючыся толькі на расчараваных, уладу можна здабыць, але не ўтрымаць. Для апошняга патрэбна падтрымка так званых грамадзкіх і палітычных эліт. Таму ён таксама актыўна займаецца «паляваньнем на аўтарытэты». І мае ў сваёй калекцыі Ону Юкнявічэнэ, дарадцу Сусьветнага банку, якая аднаўляе банкаўскую сыстэму ў Сэрбіі. Мае ў калекцыі таксама спартоўцаў (футбалістаў, баскетбалістаў, бегуноў), опэрных сьпевакоў, вядомых бізнэсмэнаў, артыстаў, журналістаў.

LIETUVOS ŽINIOS, ЦАВ

Віктар Успаскіх (зьлева) — супэрПаксас?

А на найвышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў ён мае «кучы кампрамату». Так ён заявіў журналістам з газэты «Respublika».

Аднак большасьць літоўскіх палітолягаў і камэнтатараў бачыць ва Ўспаскіх чалавека Крамля, якому пастаўлена задача перахапіць уладу ў Літве. Гэтыя камэнтатары кажуць, што дапамога расейскага бізнэсмэна Юр'я Барысава на выбарах Паксасу й імкненьне Ўспаскіх выйграць парлямэнцкія выбары — гэта элемэнты адной і той жа гульні.

«Калі аказалася, што літоўскія спэцслужбы разам з амэрыканскімі перашкодзілі ўтрымаць пасаду чалавеку (маецца на ўвазе Паксас), які зьяўляецца агентам ці ў найлепшым выпадку марыянэткай Крамля, было вырашана рэалізаваць плян Б, гэта значыць увесьці ў Сойм Успаскіх», — піша палітоляг Ромуальдас Юкнус.

Раймундас Лапата, дырэктар Інстытуту міжнародных адносін і палітычных навук, лічыць, што зьяўленьне Ўспаскіх стане зразумелым, калі ўзяць пад увагу суседзтва Расеі. «Нічога дзіўнага, што яна імкнецца падпарадкаваць сабе Літву. Але, каб абараніцца, мала будзе зьняць Паксаса, а потым перакрыць дарогу да ўлады Ўспаскіх. Зьнікнуць адзін і другі — адразу знойдуцца іншыя. Адзіным шляхам застаецца рэфармаваньне краіны, ліквідацыя «зоны галечы» — натуральнага апірышча гэтых людзей».

І вось апошняя навіна зь Вільні: Партыя працы Літвы мае трох магчымых кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта краіны. Віктар Успаскіх у якасьці кандыдатураў разглядае галоўнага «перамоўніка» па ўступленьні Літвы ў ЭЗ Пятраса Аўштравічуса, дарадцу Сусьветнага банку Ону Юкнявічэнэ і прафэсара-кардыяхірурга Рымантаса Бенэтыса. Са словаў Успаскага, партыя згадзілася б падтрымаць і кандыдатуру в.а. прэзыдэнта Літвы Артураса Паўлаўскаса, «калі за гэта выкажуцца ўсе палітычныя партыі краіны і ён будзе адзіным кандыдатам супраць Паксаса».

Франц Субель

Клінічная сьмерць за тры эўра

Былы загадчык артапэдычнага аддзяленьня санаторыю «Беларусь» у Друскеніках, кіраўнік Таварыства беларускай культуры Друскенікаў Іван Ломаць ледзь не памёр на гарадзенскім вакзале. Некалі дзякуючы ягоным намаганьням санаторый «Беларусь» застаўся беларускім.

Былы доктар вяртаўся 21 сакавіка ад сына з Горадні дадому ў Літву. І зьбіраўся набыць квіток за літы ў літоўскім аўтобусе, які абсталяваны касавым апаратам. Аднак беларуская пасадачная кантралёрка заявіла, што ўсе білеты трэба купляць у касах аўтавакзалу, а літоўскі кіроўца ня мае права тутака прадаваць іх.

Рэч у тым, што пры пакупцы квіткоў у касах аўтавакзалу замежнікам даводзіцца аплачваць яшчэ і мясцовы збор у 8750 рублёў, ці 3 эўра, які ў квітках пазначаны як экалягічны. Зь беларускіх грамадзян спаганяецца 4375 рублёў. Калі ж набываць квіткі ў кіроўцы літоўскага аўтобуса «Горадня—Коўна», дык гэтага збору можна не плаціць.

Згодна з пастановай Савету Міністраў Беларусі №227 ад 3 сакавіка 2004 г., супрацоўнікі «Беларусі», а таксама людзі, якія маюць сваякоў у прыгранічнай зоне, вызваляюцца ад выплаты мясцовага збору. Гэта Іван Ломаць і спрабаваў давесьці кантралёрцы. Аднак тая, нічога на слухаючы, спрабавала выпіхнуць старога чалавека з аўтобуса. Ад гэткіх паводзін Ломацю зрабілася блага, і ён страціў прытомнасьць. Супрацоўнікі «хуткай», якія прыбылі на станцыю, канстатавалі клінічную сьмерць. Робячы ўкол, яны, аднак, ніяк не маглі трапіць у вену. Ломаця выратавала прысутнасьць сына — рэаніматара паводле спэцыяльнасьці, які пачаў рабіць штучнае дыханьне і масаж сэрца. Пазьней па спадара Ломаця прыехала рэанімацыйная машына Гарадзенскай абласной больніцы. Цяпер стары чалавек крыху акрыяў і працягвае лячыцца ў Горадні.

Як патлумачыла «НН» адна з супрацоўніц гарадзенскага аўтавакзалу, якая пажадала не называць свайго імя, пастанова Савету Міністраў выконваецца. Ільготы існавалі, існуюць і будуць існаваць, бо ёсьць даволі доўгі пералік тых, з каго мясцовы збор не бярэцца. Проста пры набыцьці квітка касірцы трэба паказваць дакумэнт на льготы, а «ў некаторых выпадках — шмат дакумэнтаў». Дарэчы, на Радаўніцу быў наплыў пасажыраў, якія не плацілі мясцовага збору: да льготнікаў аднесены і тыя, у каго ў памежнай зоне пахаваныя сваякі. Пра Ломацеў выпадак супрацоўніца вакзалу нешта чула, аднак «гэта прыватнае здарэньне, якое патрабуе разьбіральніцтва». Паводле яе словаў, «касы створаны для таго, каб там набываліся квіткі, а кантралёры — каб без таго квітка нікога ў салён аўтобуса не пускаць. Дзеля гэтага маюцца адмысловыя інструкцыі».

Руслан Равяка

ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

Пракуратура Ленінскага раёну Горадні 8 красавіка вынесла папярэджаньне рэдактарцы газэты «Биржа информации» **Алене Раўбецкай** за распаўсюд інфармацыі ад імя незарэгістраванай партыйнай структуры: за артыкул старшыні абласной арганізацыі АГП, якой у жніўні 2003 г. адмовілі ў рэгістрацыі. 13 красавіка суд Ленінскага раёну Менску пакараў **Міхаіла Марыніча** штрафам у 10 базавых велічыняў (190 тыс.руб.) за артыкул «Каляпс?» у «Народнай волі». Марыніч падпісаўся сябрам грамадзкай арганізацыі «За годнае жыцьцё», хоць яна яшчэ не зарэгістраваная. У Горадні 13 красавіка падчас распаўсюду бюлетэню «Предприниматель» затрымалі **Зьмітра** і **Ўладзімера Леванеўскіх**. Іх адпусьцілі без пратаколаў. Актывістка «Зубра» **Дар'я Малдаванава**, якую затрымалі каля расьцяжкі «Ён павінен сысьці!» на мосьце над Нямігай, аштрафаваная 14 красавіка на 20 б.в. (380 тыс. руб.). Гарадзенскі абласны суд адмовіў прафсаюзнаму актывісту гарадзенскага заводу аўтаагрэгатаў **Івану Роману** ў аднаўленьні на працы. Супрацоўнікі КДБ выклікалі на «размову» сябра Рады Задзіночаньня беларускіх студэнтаў **Сержука Семенюка**: іх цікавіла дзейнасьць і замежныя кантакты ЗБС. Судовы працэс па ліквідацыі ГА **«Беларускае аб'яднаньне маладых палітыкаў»** пачаўся ў Вярхоўным судзе 14 красавіка: арганізацыю вінавацяць у парушэньні юрыдычнага адрасу й нясвоечасовай зьмене назвы кіраўніка («прэзыдэнта» на «старшыню» памянялі толькі ў сьнежні 2003 г.). 15 красавіка ў Воршы пазбавілі ліцэнзіі апошнюю недзяржаўную рэгіянальную газэту **«Віцебская трыбуна»**. Афіцыйная падстава — ліквідацыя заснавальніка, цэнтру моладзевых ініцыятываў «Контур». Калегія Менгарсуду 15 красавіка адпрэчыла касацыйную скаргу лідэра Жодзінскай суполкі ПБНФ **Аляксея Лапіцкага** і актывісткі ліквідаванага праваабарончага цэнтру «Вясна» **Сьвятланы Лапіцкай.** Яны скардзіліся на старшыню ЦВК Лідзію Ярмошыну, што праігнаравала іхныя звароты пра парушэньне выбарчага заканадаўства. Журналіст **Валер Шчукін** 15 красавіка быў пазбаўлены акрэдытацыі ў палаце прадстаўнікоў. Падчас раздачы ўлётак «Пяцёркі +» 14 красавіка ля прахадной Менскага заводу колавых цягачоў затрымалі актывістаў АГП **Віталя Рымашэўскага** і **Юр'я Бычкоўскага**. Актывіста «Зубра» **Арцёма Ластавецкага** затрымалі 16 красавіка ў каледжы лёгкай прамысловасьці ў Баранавічах пры распаўсюдзе газэты «Зубр-Барановичи». На ягоных бацькоў склалі пратакол за тое, што не надаюць увагі выхаваньню сына. Улады Барысава не дазволілі прадстаўнікам **кааліцыі «Пяцёрка +»** правесьці мітынг 17 красавіка «з прычыны няправільнага афармленьня дакумэнтаў». Камунальная служба скасавала дамову арэнды памяшканьня з гарадзенскім **ГА «Бацькаўшчына»**: камунальнікі лічаць, што арганізацыя здала памяшканьне ў субарэнду газэце «День», хоць уся аргтэхніка выданьня месьціцца ў суседнім пакоі, які займае ТБМ. У той самы дзень ЖРЭУ запрапанавала «добраахвотна скасаваць» дамову пра арэнду і ў трохдзённы тэрмін сплаціць усе пазыкі гарадзенскай арганізацыі **БНФ «Адраджэньне»** і клюбу **«Паходня» —** іначай выселяць і спаганяць грошы будуць праз суд. Вярхоўны суд 16 красавіка з прычыны неадпаведнасьці юрыдычнага адрасу рэальнаму ліквідаваў ГА **«Новая група»**, арганізацыя мае працаваць неафіцыйна. 16 красавіка Мінюст адмовіў у рэгістрацыі **Рэспубліканскай дэмакратычнай партыі** й **Партыі свабоды й прагрэсу.** Журналістку «Газеты для вас» **Тамару Шчапёткіну** 16 красавіка аштрафавалі на 300 тыс. руб. за «зьнявагу гонару й годнасьці» старшыні ўчастковай выбарчай камісіі Ніны Пратасевіч. Судовыя выдаткі, якія мусіць сплаціць Т.Шчапёткіна, склалі 190 тыс. руб.

АШ

Мальдзіс у больніцы

З траўмамі патрапіў у больніцу прафэсар Адам Мальдзіс: 14 красавіка ўдзень яго зьбіла машына. Гэта здарылася на рагу Казлова й праспэкту Скарыны. Навуковец пераходзіў вуліцу не праз падзямельны пераход. За апошнія паўтара году навуковец другі раз трапляе ў больніцу з траўмамі — мінулы раз яго зьбілі й абрабавалі.

АШ

Патрыярх беларускага Касьцёлу

18 красавіка каталікі заходняй Віцебшчыны ўрачыста адзначылі 60-годзьдзе сьвятарскай дзейнасьці ксяндза-марыяніна Люцыяна Паўліка, які апошнія 47 гадоў служыў у Задароскім касьцёле Маці Божай Ласкавай на Глыбоччыне.

Пасьля вайны айца Люцыяна, які ў той час служыў у Друі, арыштавалі і саслалі ў лягер на шэсьць гадоў. Вярнуўшыся ў Беларусь, ён стаў пробашчам Задароскага касьцёлу — таемна хрысьціў нованароджаных і дарослых, выконваў сакрамант шлюбу, прымаў споведзі. І ўсё гэта ён рабіў для каталікоў ня толькі Глыбоцкага раёну, але і ўсёй Віцебшчыны. Сёньня ў Полацку кажуць, што палова вернікаў мясцовай каталіцкай парафіі хрышчаныя ксяндзом Люцыянам. 18 красавіка, дакладна ў дзень яго сьвятарскага пасьвячэньня, адбылася ўрачыстая імша ў Задароскім касьцёле, на якую сабраліся сьвятары і вернікі з розных куткоў вобласьці. Удзельнікі сьвята віншавалі пробашча кветкамі і падарункамі.

«5+» у Полацку

18 красавіка ў Полацку адбылася сустрэча актывістаў дэмакратычнага руху Полаччыны з Анатолем Лябедзькам і Сяргеем Калякіным, а таксама намесьнікамі старшыняў БСДГ Валер'ем Арцішэўскім і Партыі працы Леанідам Лемяшонкам.

С.Калякін расказаў пра народную перадвыбарную кааліцыю «5+», яе мэты і задачы. Прычыну аб'яднаньня ён патлумачыў наступным чынам: кожная партыя, якая ўвайшла ў кааліцыю, асобна мае ня больш за 7% падтрымкі выбаршчыкаў, а разам дэмакраты цяпер маюць 30% падтрымкі. Калякін сярод прычын аб'яднаньня назваў і пагрозу правядзеньня рэфэрэндуму, які б дазволіў Лукашэнку трэці раз, насуперак Канстытуцыі, удзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах. Лідэр камуністаў расказаў пра тактыку і стратэгію кааліцыі: вырашана ў кожнай выбарчай акрузе вылучаць двух кандыдатаў — асноўнага і дублёра, прычым адзін зь іх будзе рэпрэзэнтаваць левыя погляды, другі — правыя.

Калдуны ў «Славянскім»

Калі ў Наваполацку, напрыклад у рэстаране «Белы востраў», спрабуюць заваблiваць наведнікаў замежнай экзатычнай кухняй — кітайскай, францускай, — дык у Полацку абралі іншую стратэгію. Тут разважаюць наступным чынам: стравы замежных кухняў турыст можа пакаштаваць у іншых краінах, а вось беларускія — толькі ў Беларусі. Рэстаран «Славянскі», які знаходзіцца пры гатэлі «Дзьвіна», цяпер штосераду наладжвае ў сябе дзень беларускай кухні. У такія дні тут можна паспытаць і булён з калдунамі, і мачанку з блінамі, і дранікі. Высьвятляецца, што і эканоміка можа навучыць патрыятызму, бо патрыятычны лозунг «Купляй сваё, шануй сваё!» — самы што ні ёсьць рынкавы.

У Полацку чакаюць Хруцкага

16 красавіка ў Полацкай мастацкай галерэі адкрыліся выставы жывапісу дырэктара Нацыянальнага мастацкага музэю Ўладзімера Пракапцова, а таксама жывапісу і керамікі яго сына Паўла Пракапцова. Мастакоў, сярод іншых, вітаў япіскап Полацка-Глыбоцкі Феадосій. У.Пракапцоў прызнаўся, што ня лічыць сябе высокаадораным мастаком: «Я дырэктар, а карціны пішу толькі ў вольны час, для сябе, і гэтая выстава — хутчэй нагода прыехаць у ваш цудоўны горад». Палачане выказалі просьбу-спадзяваньне, што неўзабаве карціны іх земляка Івана Хруцкага, якія захоўваюцца ў Мастацкім музэі, вернуцца ў Полацак — хаця б для часовага экспанаваньня.

У гэты ж дзень у канцэртнай залі Сафійскага сабору пачаўся XVII Міжнародны фэстываль камэрнай музыкі. «Літургію Яна Залатавуснага» Сяргея Рахманінава выканала Капэла імя Шырмы.

Васіль Кроква, Полацак

Замест інстытуту — псыхбольніца

Закрываецца Магілёўскі інстытут радыяцыйнай мэдыцыны і прафпаталёгіі. Такое рашэньне аблвыканкаму: у будынак інстытуту, дзе з канца 80-х інтэнсіўна лячылісь пацярпелыя ад Чарнобылю дзеці, будзе перамешчана псыхіятрычная больніца. У новым штатным раскладзе месцаў для 370 чалавек, якія працавалі ў інстытуце, не знайшлося. І калі ўрачам прапанаваны альтэрнатыўныя варыянты працаўладкаваньня, дык сярэдні і малодшы мэдыцынскі пэрсанал у паніцы. Забясьпечаць работай усяго 10% мэдсясьцёр і некалькі санітарак, якія працавалі ў інстытуце.

Алеся Чыж, Магілёў

Рамонт для прэзыдэнта

Пасьля нуднай зімы вясна вымагае распачаць нейкія работы — нешта паднавіць ці адрамантаваць. У Баранавічах парадкуюць галоўныя вуліцы гораду. На некалькі дзён былі перакрыты вул.Леніна і Камсамольская, а аўтамабільны рух скіравалі на паралельныя вуліцы, выклікаючы там заторы, бо кальцавой дарогі ў Баранавічах няма. На асабліва небясьпечных скрыжаваньнях зьявіліся даўно забытыя рэгуліроўшчыкі.

Рамонт галоўных вуліц пачаўся таму, што па іх стала немагчыма езьдзіць: асфальт тамака зьнішчаны на 40%. Дзеля рамонту горад узяў напракат адмысловую тэхніку, якая фрэзамі зразае стары асфальт на глыбіню 5—15 мм. Атрыманы друз плянуецца перапрацаваць і выкарыстаць для новага пакрыцьця. За тое абсталяваньне давядзецца заплаціць каля 60 млн руб. з гарадзкога бюджэту.

Зрэзаўшы асфальт і пакінуўшы на цэнтральных вуліцах няроўныя пісягі ад фрэзаў, на нейкі час спыніліся. Усе сілы цяпер кінуты на іншыя аб'екты — горад чакае прыезду Лукашэнкі на пачатку траўня. Камунальшчыкі кінуліся добраўпарадкаваць тэрыторыю старога пэдагагічнага каледжу, на базе якога думаюць заснаваць унівэрсытэт і які наведае прэзыдэнт. Парэзалі старыя кляновыя прысады, зьдзіраюць на ходніках пліткі, нешта падфарбоўваюць, замазваюць. Таксама сьпешнымі тэмпамі даводзяць да ладу стадыён — на недабудаванай трыбуне ўкручваюць рознакаляровыя сядзеньні.

Мэр гораду Віктар Дзячкоўскі абяцае, што вуліцы да 1 траўня заасфальтуюць. Аднак, відаць, аднавіць, а дзе-нідзе і пракласьці ліўнёўку за такі тэрмін не пасьпеюць. Мяркуюць, што ўсё добраўпарадкаваньне абыдзецца ў 600 млн руб.

Аднак, як заўсёды, дзеля жаданьня вылучыцца і падацца больш прывабнымі ды прыгожымі, забываюць пра якасьць.

РР, Баранавічы

«Троіца» ў Берасьці

У суботу ў Тэатры драмы і музыкі ў Берасьці можна было пабачыць этна-трыё «Троіца». Гурт упершыню выступіў у Беларусі паза межамі Менску. На жаль, заля была няпоўная, хаця публіка ўспрыняла музыку зь вялікім захапленьнем і не хацела адпускаць са сцэны. Тады Кірчук выйшаў і зайграў фінальную песню на старажытным інструмэнце — касе.

Дарэчы, гурт адзначае сямігодзьдзе і праз тры тыдні пляную выдаць трэці свой альбом пад назвай «Сем». Берасьцейцы пачулі песьню з гэтага альбому — «Сем чарак гарэлкі».

Валеры Строкач, Берасьце

Сяргею Салашу ад уладаў Барысава

Напярэдадні суботніку 24 красавіка нефармальны грамадзкі лідэр Барысава Сяргей Салаш атрымаў ад кіраўніка камунальных службаў адмысловае запрашэньне. Варта нагадаць, што на мясцовых выбарах Салаша не зарэгістравалі ў якасьці кандыдата з надуманых прычынаў. Цяпер Сяржук гатовы ўзяць удзел у парлямэнцкіх выбарах увосені.

Багацьці для багатых

Закон схіляе паляўнічых да браканьерства

Машканская паляўнічая гаспадарка перададзена абутковай фірме «Марка-сэрвіс», Цяцерынская, Браслаўская, Краснасельская адышлі да Кіраўніцтва спраў прэзыдэнта. Беларусь — краіна шыкоўных лясоў. Аднак паляваць у іх хутка змогуць толькі абраныя.

Аляксей Ямкевіч

Хутка шараговым грамадзянам паляваць на жывёлу можна будзе толькі праз вітрыннае шкло.

Захапленьне ловамі зрабілася складнікам нацыянальнай культуры. Рыбалоўныя ці паляўнічыя нататкі можна сустрэць у творах Быкава і Брыля, Коласа і Дубоўкі. Штогод у розных кутках Беларусі ладзяцца фэсты, якія выяўляюць найлепшых стральцоў ці рыбароў. Для нясьпешчанага вялікімі прыбыткамі беларуса паблукаць па лесе са стрэльбай ці ўладкавацца на беразе рачулкі — ці не адзіны від актыўнага адпачынку. Ня маючы сродкаў на спартклюб, вясковец карыстаецца тым, што засталося яму ў спадчыну, — багацьцем роднай прыроды. Аднак ён мае ўсе шанцы страціць і гэты прывілей. Калі рыбакі ва ўмовах вынішчэньня фаўны рэк ды азёр браканьерамі яшчэ маюць магчымасьць сям-там спадзявацца на нейкую здабычу, дык вакол аматараў паляваньня сытуацыя склалася куды больш складаная.

Справы мінулых дзён

На пачатку 90-х большасьць паляўнічых гаспадарак краіны (каля 80%) на правах арэнды належала галоўнаму аб'яднаньню аматараў стрэльбы і вуды — Беларускаму таварыству паляўнічых і рыбаловаў (БТПР). Астатняе дзялілі між сабой Вайсковае таварыства паляўнічых, Камітэт лясной гаспадаркі ды фізкультурна-спартовае таварыства «Дынама». Паляўнічы набываў у таварыстве сэзонны квіток на адстрэл зьвяроў у межах пэўнай гаспадаркі.

Прыналежнасьць да таварыства была неабходнай умовай для атрыманьня паляўнічага пасьведчаньня і набыцьця стрэльбы. Ня дзіва, што колькасьць паляўнічых у БТПР набліжалася да ста тысяч.

Непразуменьні паміж таварыствам і дзяржавай пачаліся ў 1997 г. з пастановы Саўміну, згодна зь якой права выдаваць паляўнічыя пасьведчаньні пераходзіла да Камітэту лясной гаспадаркі. Сяброўства ў БТПР зрабілася справай неабавязковай, таму менш прывабнай, а перавагай аб'яднаньня засталіся толькі таньнейшыя сэзонныя квіткі. І за 1998—2004 г. колькасьць сяброў БТПР зьменшылася практычна на траціну: з 99 да 63 тыс.

У 2002 г. паляўнічых напаткала яшчэ адна несуцяшальная навіна. Чарговая пастанова Саўміну значна зьмяніла характар і кошт абавязковых працэдур. Памер дзяржаўнай пошліны павялічыўся ў 50 (!) разоў — 10 базавых велічынь за раз (190 тыс. руб.) замест 0,2 штогод. Кошт рэгістрацыі і перарэгістрацыі кожнай адзінкі зброі (4 і 2 б.в. адпаведна) павялічыўся ў 8 разоў. Пры гэтым дзяржаўны падатак цяпер трэба плаціць на дзесяць гадоў наперад. Гэта найбольш зачапіла людзей немаладых, якія ня ведаюць, ці будуць займацца паляваньнем увесь гэты час. Да 2007—08 г., калі скончыцца тэрмін дзеяньня дзяржаўных пасьведчаньняў, колькасьць зарэгістраваных паляўнічых у краіне можа зьменшыцца на 50%.

А вось колькасьць браканьераў вырасьце, мяркуе загадчык аддзелу паляваньня, рыбалоўства і праектаваньня паляўнічай гаспадаркі БТПР Валер Квакін. На яго думку, паляўнічыя папросту пачнуць утойваць зброю ад рэгістрацыі.

Паляваньне зрабілася забаўкай для заможных. Дзяржчыноўнікі і самі гэта прызнаюць. «Гэта элітны занятак для багатых грамадзян», — заявіў намесьнік міністра прыродных рэсурсаў Валянцін Малішэўскі.

Няма прыбытку — няма ўлады

У сьнежні 2003 г. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя накіравала мясцовым уладам рэкамэндацыю перадаць паляўнічыя гаспадаркі БТПР ва ўласнасьць прыватных асобаў.

БТПР не задавальняла Мінпрыроды малапрыбытковасьцю. У прыклад таварыству Міністэрства ставіла паляўнічыя гаспадаркі, што належаць прыватным асобам ды Кіраўніцтву справаў прэзыдэнта.

Сапраўды, частка гаспадарак БТПР знаходзіцца ў цяжкім фінансавым становішчы і не адпавядае сучасным патрабаваньням. Аднак жа БТПР — аб'яднаньне выключна грамадзкае, яно не атрымлівае фінансаваньня зь бюджэту і існуе менавіта за кошт сяброўскіх складак ды продажу сэзонных квіткоў.

Пікантнасьці сытуацыі дадае іншы факт. Калі зьбяднелыя гаспадаркі перадаюць больш забясьпечанаму ў фінансавым пляне ўласьніку, які гатовы ўкласьці ў набытую маёмасьць неабходныя сродкі дзеля яе росквіту, — гэта лягічная зьява. Аднак Мінпрыроды дзейнічае ў іншым напрамку. За апошнія гады ад таварыства адлучаны Машканская (перададзена вядомай фірме «Марка-сэрвіс», што займаецца продажам абутку), Цяцерынская, Браслаўская, Краснасельская (усе адышлі да Кіраўніцтва спраў прэзыдэнта) і шэраг іншых гаспадарак, якія мелі найлепшыя паказчыкі разьвіцьця.

Усё для эўрапаляўнічых

Падуладных БТПР угодзьдзяў пакуль 114 — гэта 68% ад колькасьці сукупных лясных масіваў краіны. За апошнія гады ў прыватную ўласнасьць перайшло 10 паляўнічых гаспадарак. Лічба невялікая, калі ня браць пад увагу часавага адрэзку, за які адбыўся той пераход.

Чаму ж вакол паляўнічых гаспадарак узьняўся гэткі вэрхал, адкуль спрэчкі й непаразуменьні? Ёсьць два галоўныя чыньнікі.

Першы — матэрыяльны. Апошнім часам Беларусь аблюбавалі паляўнічыя зь Нямеччыны, Італіі ды іншых краін. Выкладваючы за паляваньне астранамічныя па нашых мерках сумы (адна толькі ліцэнзія на здабычу пэўнага зьвера каштуе ад тысячы даляраў і вышэй, у залежнасьці ад памеру будучага трафэю). Гэткага багацьця жывёлы ў капіталістычнай Эўропе не знайсьці. У тамтэйшых лясах перарадзіліся дзікі, яны не дасягаюць тых памераў, што вартыя воку паляўнічага, практычна зьнік лось, толькі зрэдку сустракаецца алень. Таму іншаземцы з асалодай блукаюць па беларускіх лясах.

Попыт нараджае прапанаваньне. Праца з эўрапаляўнічымі абяцае нядрэнныя дывідэнды. Як грыбы, пачынаюць зьяўляцца фірмы, у пераліку відаў дзейнасьці якіх фігуруе паляваньне для замежнікаў. Новаўтвораным суб'ектам гаспадараньня для плённай працы не стае аднаго — уласных лясных угодзьдзяў, якімі яны і пачалі абзаводзіцца.

Колькасьць сяброў Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў на 01.01.2004 (тыс. чалавек)

У Гомельскай і Магілёўскай абласьцях найменш зарэгістраваных паляўнічых. Значыць, найбольш браканьераў?

Другі чыньнік — хутчэй эстэтычны. Добра, маючы грошы, збудаваць ва ўтульным лясным займішчы палацык з лазьняй. Аднак удвая большую асалоду ад лазьні адчуваеш, калі ведаеш, што ніякая жывая душа цябе не патурбуе. Бо найбліжэйшае навакольле — таксама твая ўласнасьць.

Ня дзіва, што ад паляўнічых паступае ўсё больш скаргаў на забарону наведваць пэўныя лясы. Так, у Краснасельскай гаспадарцы, аб якой згадвалася вышэй, паляваньне афіцыйна забаронена ўжо два гады.

У Нямеччыне, Польшчы, Чэхіі ўсе лясныя ўгодзьдзі належаць прыватным уладальнікам. Паляўнічыя клюбы (аналяг нашых таварыстваў) там заключаюць дамовы і на правах арэнды карыстаюцца ўгодзьдзямі ды ладзяць уласнае паляваньне.

Аднак ветрык новаўвядзеньняў падзьмуў у беларускую паляўнічую гаспадарку не адтуль, а з Расеі. Там ужо некалькі гадоў, пад выглядам ліцэнзаваньня, гаспадаркі Расейскага таварыства паляўнічых і рыбаловаў адчужаюцца на карысьць камэрцыйных структураў. Зразумела, што грамадзкія таварыствы ня здольны спаборнічаць зь бізнэсоўцамі ці мясцовымі кіраўнікамі. Сярод новых уладальнікаў расейскіх лясоў — «Лукойл-Нафтахім», будаўнічая фірма «Сапсан» з Адміністрацыі прэзыдэнта РФ, а таксама вядомыя культурныя і палітычныя дзеячы.

Дзяржаўныя патрэбы і грамадзкія інтарэсы

Нельга сьцьвярджаць, што паляўнічыя гаспадаркі ніколі ня варта перадаваць у прыватную ўласнасьць. Прыватнік плаціць за арэнду больш, чым грамадзкае аб'яднаньне, — выгада для мясцовага бюджэту відавочная. Прыватнік лягчэй знаходзіць інвэстыцыі, у яго гаспадарцы лепшыя гатэлі, падкормачныя комплексы, стралковыя вышкі.

Аднак у мэдаля ёсьць і адваротны бок. Уклаўшы значныя сродкі, гаспадар намагаецца за вельмі кароткі тэрмін іх вярнуць: завышае цэны на абслугоўваньне наведвальнікаў і здабычу жывёлы. Іншая рэч, калі ўласьнік грунтоўна падыходзіць да справы, працуе пэўны час на пэрспэктыву і не імкнецца да імгненнага прыбытку. У гэтым выпадку прыватная ўласнасьць больш эфэктыўная за калектыўную. Многае залежыць непасрэдна ад асобы ўласьніка.

Прыклад Расеі непакоіць беларускіх паляўнічых. Яны лічаць, што дзяржава рыхтуе такі самы «падарунак» і айчынным сьледапытам. У спэцыялізаваныя выданьні ідуць гнеўныя лісты ад нездаволеных аматараў, у гутарках паляўнічых усё часьцей чуваць заклапочанасьць невядомай будучыняй ды патрабаваньні пакінуць лясы за імі. «Калі б чалавек намагаўся ўкласьці сродкі ў разьвіцьцё ўласнай справы, ці рваў бы ён спакусьлівы кавалак паляўнічых угодзьдзяў? — кажа Валер Квакін. — Так, магчыма, у бізнэсоўцаў, што ўзялі лясныя масівы, зарабляць грошы ўдасца лепш. Аднак шматлікім аматарам паляваньня застанецца толькі збоку назіраць за прыродай, а карыстацца багацьцямі яе змогуць толькі багатыя».

Сяргей Гусачэнка

У адрозьненьне ад расейцаў,

Арнольд Макмілін: Я гатовы прызнаць, што Панчанка — добры паэт

Ён спазьняўся на гадзіну з чвэрткаю… Гэта цалкам адпавядала майму ўяўленьню пра дзівакаватых ангельскіх прафэсараў. Таму мы з фатографам Андрэем Лянкевічам не турбаваліся, працэджвалі натоўп, высочваючы Арнольда Макміліна, якога ня бачылі ў вочы. Заклад быў такі: хто яго першы пазнае, таму пяць фунтаў стэрлінгаў. «Вось!!!» — зараўлі мы адначасова, пабачыўшы гнанага ветрам невысокага спадаронька ў вялікіх акулярах, у дарагім, запэцканым крэйдаю палітоне і з чорным поліэтыленавым мяшэчкам у руцэ.

Спазьненьне прафэсара нічога супольнага з расьсеянасьцю ня мела: проста раніцаю на кватэру, якую ён наймаў, зьявіліся два міліцыянты і вірлавокая танкагубая кабеціна ў цывільным, якая не палічыла патрэбным адрэкамэндавацца. («Ну чысты тып, дзе яны такіх бяруць?» — дзівіўся прафэсар.) Прыхадняў цікавіла, чаго сп.Макмілін прыехаў, а таксама ці зарэгістраваўся ён у Менску. «Я ня буду рэгістравацца ні пры якіх умовах», — адказаў прафэсар. Мы сказалі, што цалкам яго разумеем, і павялі прафэсара ў кавярню — размаўляць і фатаграфавацца.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Доўгі час беларуская была маёй пасіўнай мовай, але я сустрэў Алеся Пашкевіча, гаварыў да яго па-расейску, а ён адказваў па-беларуску, і мне стала сорамна. І я загаварыў. Хоць гэта было няпроста. У мяне расейская жонка, і дома мы гаворым на расейска-ангельскай трасянцы, а калі размова ідзе пра штосьці абсурднае, мы гаворым па-нямецку. Нямецкая мова — цудоўная мова для абсурду. Мы з жонкай — ужо ня першай сьвежасьці асятрына, таму нашыя зацікаўленьні ціхія: падарожжы ў цёплыя краіны, напрыклад. А мая першая жонка напісала ў разводным пратаколе: «Арнольд любіў сабак болей, чым мяне».

«НН»: А калі я задам тое ж кадэбоўскае пытаньне: «Прафэсар, чаго вы сюды прыехалі?»

Арнольд Макмілін: Каб забраць кнігу аб беларускай літаратуры ў эміграцыі. Нехта скажа: нашто ехаць, калі ёсьць пошта? Але я хацеў сваімі рукамі забраць асобнікі для сваіх сяброў, якія жывуць не ў Беларусі. Я не даверыў бы іх пошце.

«НН»: Гэта будзе Ваша чацьвертая кніжка?

А.М.: Магчыма, калі лічыць толькі манаграфіі. Былі «Беларуская мова ў XIX ст.», «Беларуская літаратура ад пачатку да Апакаліпсысу». Пасьля гэтага агляду ў мяне настаў застой: ня вельмі ўдалы шлюб, дзеці расьлі. Для кніг трэба мець энэргію, а калі тваё сэрца не дапамагае, кнігі немагчымыя. Потым у мяне настаў рэнэсанс, і я выдаў новую кнігу ў Нямеччыне, і адна жанчына тут пераклала яе на беларускую мову, і яна ў 2001 г. выйшла ў «Беларускім кнігазборы». І новая кніжка, «Беларуская літаратура дыяспары», выйшла два гады таму ў Англіі і днямі тут — у перакладзе на беларускую. Я пішу пра аўтараў эміграцыі — Арсеньневу й іншых, а другая палова прысьвечаная беларусам Польшчы. А таксама тым, кім цікавяцца незаслужана мала, — Віктару Кірвелю, Іне Снарскай.

«НН»: Чуваць, што вы зьбіраецеся напісаць кнігу пра беларускую літаратуру ад 1970 г. да Міленіюму?

А.М.: Так, але гэта забярэ шмат энэргіі. А я ўжо стары. Еджду ў лёнданскім транспарце па бясплатным пэнсіянэрскім квітку. Але я хачу скончыць гэтую кнігу да таго, як адыду на адпачынак. Я ўжо напісаў пра Стральцова, Барадуліна, Разанава, нядаўна скончыў пра Сыса. Няшчасны чалавек, але цудоўны паэт. Потым я напішу пра Някляева й гістарычную прозу — Арлова і іншыя постаці. Я актыўна цікаўлюся й моладзевай літаратурай, зьбіраю кнігі, стараюся зьведаць, хто й што. Перакладчыкамі апошняе мае кнігі былі маладыя паэты Віктар Жыбуль і Вера Бурлак.

«НН»: Хто Ваш любімы беларускі аўтар?

А.М.: Быкаў, па-за канкурэнцыяй. Я нарадзіўся за дзень да таго, як немцы напалі на Беларусь, — 21 чэрвеня 1941 г. Быкаў імпанаваў праўдай. У расейскай і беларускай літаратуры пра вайну зашмат хлусьні й фантазіі. Быкаў быў першы. А потым быў Булат Акуджава, які надрукаваў у Вугоршчыне артыкул (наіўны, думаў, што па-вугорску не прачытаюць) з асноўнай думкай: «Гэта не была вялікая вайна. Гэта была жудасная вайна». Зразумейце, наколькі важна было сказаць гэта. Я бачыў Быкава апошняга разу ў Нямеччыне, я адчуваў, што яму засталося нядоўга. Мы елі піцу і пілі розныя напоі. Ён піў мала, але я быў гатовы на ўсё. І потым мы з жонкаю хацелі адведаць яго ў Празе, але ён выехаў у Беларусь, каб памерці. Я напісаў нэкралёг у «Guardian». Я пішу ў гэтую газэту нэкралёгі, калі просяць. Быкаў быў мне вельмі блізкі чалавек. Ён сэрца й гонар Беларусі. Адзіны, хто можа заняць месца маральнага аўтарытэта, — Барадулін. Але ён таксама немалады… Калі Быкава запрасілі ў Лёндан, замест яго прыехаў Барадулін, і мы такім чынам пазнаёміліся. Ён вельмі прыемны чалавек. Ды мне ўвогуле даспадобы беларусы. Яны такія сьціплыя, у адрозьненьне ад расейцаў. Расейцы лічаць сябе пупам сусьвету, а гэта ня вельмі прыемна. І, маўляў, як можа іншаземец зразумець нашу вялікую культуру? А беларусы ўдзячныя, калі замежнік цікавіцца. І гэта куды лепей, калі людзі не глядзяць звысоку. У транспарце беларусы не штурхаюцца і не крычаць «Куды прэш?!», як у Расеі.

«НН»: О, сапраўды?..

А.М.: Вы, відаць, даўно не былі ў Расеі? Беларусы ветлівыя й сьціплыя. Я гэта зьведаў яшчэ ў Ангельшчыне, калі тамтэйшыя беларусы зьнюхалі, што я вывучаю беларусістыку ў Лёнданскім унівэрсытэце. Яны запрасілі да сябе і пачаставалі, дапамагалі кнігамі. Але самае вялікае ўражаньне было падчас сацыялізму, як я быў стажорам у Маскве ды прыехаў працаваць у Менск. Тут ня ведалі, якая птушка да іх прыляцела, — думалі, як замежнік, то і багаты. Зьмясьцілі мяне ў найлепшы па тых часох гатэль — «Менск». Таму грошы, якія я разьлічваў траціць месяц, скончыліся за дзень. Аднак мяне ня выкінулі, а выдзелілі пакойчык ля самага паддашку. І гэта мне было так прыемна! Я тады працаваў над лексычным складам беларускае мовы ў Акадэміі навук, і мне трэба было вечарамі займацца. І мяне ў АН пакідалі вечарам без нагляду ў картатэцы, сказалі міліцыянтам: «Хай чалавек працуе». Гэта немагчыма ня толькі ў Маскве, але і ў Лёндане! Такі давер маладому чалавеку з Захаду ў савецкія часы быў адбіткам нейкай асаблівай беларускай якасьці. Я спускаўся па лесьвіцы й бачыў на сьценах плякаты, як уратавацца ад «тлетворного влияния Запада». А ўнізе сядзеў міліцыянт, мой раўналетак, які нават не падымаўся праверыць, ці ўсё я пакінуў у парадку.

> Дакладная прымета няшчаснай краіны — калі людзі вераць у залаты век.

«НН»: Некаторыя з канадзкіх інтэлектуалаў пішуць, што «Беларусь выстаіць і знойдзе сваё месца ў XXI ст.». Якая Ваша думка наконт гэтага?

А.М.: У беларусаў няшчасная гісторыя, вядома. Дакладная прымета няшчаснай краіны — калі людзі вераць у залаты век. Мы ў Англіі гэтага ня робім. Былі ў нас часы лепшыя, горшыя, цікавейшыя, нуднейшыя, але няма залатога ні ў мінулым, ні ў будучым. Лорд Байран на гэтую тэму напісаў «Бронзавы век».

«НН»: Нам здаецца, што наша прысутнасьць на глёбусе ня вельмі заўважная. Скажыце, ці робімся мы больш бачнымі Эўропе?

А.М.: Толькі з дрэнных прычынаў. Спачатку Чарнобыль, потым самі ведаеце хто й што.

«НН»: Як выйшла, што вы заняліся беларусістыкай?

А.М.: Я з маладосьці займаўся расейскай літаратурай і музыкай. А тады на нашай катэдры зьявіўся прафэсар з харызмай, і ўсё зазьзяла. Да яго была такая сталінская атмасфэра: усё пампэзна, прыстойна й шэра. Я кінуў сваіх Ламаносава й Сумарокава і сказаў: я хачу ў Вас вучыцца. Ён быў лінгвіст — гэта не мая спэцыяльнасьць. Але з добрым чалавекам і лінгвістыку вывучыш. І ён мне прапанаваў тэмы на выбар: «Нямецкі ўплыў на македонскую мову» або беларуская мова. Я ня ведаў ні македонскай, ні беларускай, ні нямецкай як сьлед, але выбраў я беларускую. Доўгі час беларуская была маёй пасіўнай мовай, але я сустрэў Алеся Пашкевіча, гаварыў да яго па-расейску, а ён адказваў па-беларуску, і мне стала сорамна. І я загаварыў. Гэта няпроста. Апошнія дзесяць гадоў у мяне дома расейская жонка, і мы гаворым на расейска-ангельскай трасянцы, а калі размова ідзе пра штосьці абсурднае, мы гаворым па-нямецку. Нямецкая мова — цудоўная мова для абсурду. Дарэчы, немцы лепей разумеюць расейскую, чым брытанскую ангельскую. Яны толькі думаюць, што разумеюць па-ангельску. Насамрэч яны разумеюць па-амэрыканску, а я ж не гавару як зоркі Галіўду. Немцы лічаць, што брытанцы гавораць «mundfaul» — лянівым ротам. Цяпер я еджду ня столькі па Эўропе, колькі па Паўночнай Амэрыцы — цікава, як жывуць іншыя.

«НН»: Некалі за Саветамі сын выкладчыка БДПУ Кіма Скурата Сяргей распавядаў мне, што напісана ў вашай англа-

беларусы такія сьціплыя

моўнай кніжцы «Беларуская літаратура 50—60 г.». Тады яе, як бачым, чыталі падпольна ў Беларусі. Савецкую філялягіню шакавалі вашы ацэнкі творцаў белсаўліту. Яны з часам зьмяніліся?

А.М.: Я гатовы прызнаць, што Панчанка — добры паэт.

«НН»: Усё-такі? А як наконт «Пятрусь Броўка піша лоўка, піша лоўка і даўно…»? Падаецца, Вы пагаджаліся з гэтай эпіграмай?

А.М.: Ну, тут усё засталося ў сіле. Броўка – мой асабісты вораг. (Сьмяецца.) Савецкі лад — гэта савецкі лад, нічога ня зробіш. Але ня ўсе так стараліся, як Броўка. Людзі маюць выбар — быць ці ня быць палітычным функцыянэрам, літаратурным камісарам. Адзін уляўраны літаратар (дзеці ягоныя прыстойныя людзі, таму я не памінаю імя) быў шакаваны перакладам мае кнігі. Мне распавядалі, што яна была ягонай настольнай кнігай, і, калі людзі прыходзілі да яго, ён пытаўся: «Ну няўжо я такі, як тут напісана?» Для мяне прыкмета камісарства — калі ў Заграбе на кангрэсе беларусістаў адзін такі ўстае і кажа: «Як сьмеў Макмілін пісаць пра Гаруна? Гэта драпежнік, а не беларускі літаратар». Я быў у Акадэміі навук пасьля напісаньня першай кнігі і зразумеў, што, мяркуючы па індэксе, самы вядомы беларускі пісьменьнік — Сталін.

«НН»: У Беларусі на кнігазборы дзяржава заўсёды ўплывала не найлепшым чынам. А які, на Вашу думку, будзе лёс Скарынаўскай бібліятэкі ў Лёндане?

А.М.: Пэрспэктывы няясныя. Сам айцец Надсан кожнага разу пры сустрэчы кажа мне: «Я стары». Дый здароўе ў яго ня вельмі. А зьмены моцнай няма.

«НН»: Прапалі шмат якія архівы й кнігазборы за мяжою праз тое, што нашчадкі не цікавіліся беларускай справаю.

А.М.: Ну, думаю, такі лёс Скарынаўцы не пагражае. Яе збор праз амбасадара ўжо запрасіла Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Але, ведаючы, што Беларусь — ня рай, сюды скіруюць дублікаты.

«НН»: Вы былі ў нашай краіне разоў з дваццаць. Куды дрэйфуе Беларусь?

А.М.: Я найбольш быў тут за саветамі. Падчас свабоды ня быў. Толькі ў апошнія гады стаў наяжджаць — з 1999 г. Але я ведаю, чаго Вы баіцёся. Не, не, не, Беларусь ня робіцца савецкай. Я штогод бываю ў Маскве, там мае калегі, сябры. Для мяне савецкасьць — гэта галоўным чынам Расея. Праўда, у мае апошнія візыты ў Беларусь ля мяне круціўся малады чалавек, ад якога моцна пахла КДБ. А вось міліцыянтаў я меў гасьцямі толькі сёньня.

«НН»: Што Вы любіце па-за беларусістыкай?

А.М.: Жанчын, музыку і выпіць. Мне пашанцавала з другім шлюбам. Сьвятлана, другая жоначка, напісала першую й найлепшую кнігу пра Венядзікта Ерафеева, выдадзеную ў Швайцарыі. Кніга Сьвятланы часта плягіятуецца, што ёсьць прыметай посьпеху. Мы з жонкай — ужо ня першай сьвежасьці асятрына, таму нашыя зацікаўленьні цікія: падарожжы ў цёплыя краіны, напрыклад. Я люблю сваю цяперашнюю жоначку. Мы сем-восем гадоў перапісваліся перад тым, як пажаніцца, бо я меў тады іншую жонку, маці маіх дачок. Я не хацеў кідаць сям'ю, але мая першая жонка сказала: «Арнольд, будзе». І мы разышліся без адзінага кепскага слова. Зь цяперашняй жонкай у нас густы супадаюць, мы гарадзкія пацукі і з асалодай жывём у цэнтры гораду, а вёска ці перадмесьце — не для нас. Часам я гавару зь ёй па-беларуску, а яна кажа: «Ну Арнольдзе, годзе мяне мучыць, я нічога не разумею».

«НН»: А сабак трымаеце, як належыць ангельцам?

А.М.: У першым шлюбе трымалі, і ў разводным пратаколе мая жонка напісала: «Арнольд любіў сабак болей, чым мяне». Я сапраўды заядлы сабачнік. Але цяпер не трымаем, бо жывём у цэнтры, нашто ж мучыць сабак — яны ня могуць без прасторы. Да таго ж у нас шмат гасьцей. Прыяжджаюць з Расеі шмат, спыняюцца, гэта ж бясплатны гатэль у цэнтры Лёндану! (Сьмяецца.) Гэта бывае й прыемна, а бывае і не. Мне ня надта спадабаўся госьць нашага ўнівэрсытэту Віктар Пялевін. Таленавіты пісьменьнік, але цяжкі чалавек. Заля была поўная. Жадаючы стварыць прыемную атмасфэру, я адкрыў віно да выступу, а не пасьля. Але Пялевін адмовіўся гаварыць, кажа: «Задавайце пытаньні». Але ангельцы не экстравэрты, усе сядзяць моўчкі. Тады цётухна зь першага шэрагу пытаецца: «Вы наркотыкі ўжываеце?» Той кажа: так, усё можна ўжываць, калі ў меру. Мы ня памятаем чалавека, які столькі піў за нашым сталом і нёс такую лухту. Але вось Аксёнаў і Вайновіч — вельмі прыемныя людзі. Аксёнаў мой сябра, мы шмат гадоў вельмі гумарыстычна лістуемся. Ён нармальны чалавек, а для мяне гэта найвышэйшая якасьць — нармальнасьць, гумар без экстрыму. Вайновіч — аптымальны госьць, далікатны чалавек.

«НН»: Раскажыце пра Вашу сям'ю больш падрабязна.

А.М.: Я ведаю свой род з XVII ст. Яны ратаваліся ад ангельскага ўціску ды ўцяклі з Ірляндыі ў Шатляндыю. У іх быў здаровы розум, бо сярод маіх продкаў былі і каталікі, і пратэстанты, прычым адны і другія пасядзелі ў вязьніцы. Мой продак напісаў мэмуары, іх надрукавалі, так што я цьвёрда ведаю пра свой род. І гэта прыемна для маіх дачок. Старэйшая выйшла нядаўна замуж за сур'ёзнага маладога чалавека, які грае на лютнях і зьбірае антыкварныя кнігі. Не алкаш, не хуліган зяцюхна мой. Яна працуе ў Міністэрыі дапамогі неадэкватным краінам (гэта ветлівы пераклад). Яна атрымала запрашэньне на тры гады працаваць у Сусьветным банку.

«НН»: Някепская кар'ера!

А.М.: Пабачым-пабачым. Малодшая — настаўніца малодшых клясаў недалёка ад Лёндану. Мы яе часта бачым. Гэта файна. Але часьцей мы дачыняемся праз і-мэйл. Навуковае жыцьцё сумнае, таму мне даводзіцца выдумляць тэмы для ліставаньня. А калі яны вучыліся ў закрытай школе, я пісаў ім ад імя сабак. Адзін зь іх быў добрае пароды, сноб з шыкоўнага раёну Лёндану, і ўстаўляў у ліст напышлівыя французскія выразы. А другі — дварнячок, пісаў на кокні, з памылкамі. Я апісваў жыцьцё сабачымі вачыма.

«НН»: А не спрабавалі стаць пісьменьнікам?

А.М.: Мая жоначка часам кажа: «Арнольд, зрабіся паэтам». Гэта самае простае — стаць кепскім паэтам. Але я так званы прафэсар (сьмяецца).

Гутарыла Сьвятлана Курс

Вільня 60-х і масты

Дзьве фотавыставы клясыкаў у Вільні

Адразу дзьве выставы клясыкаў фотамастацтва адбываюцца ў Вільні.

Першая — гэта экспазыцыя «Фатаграфуючы Вільню. 1963—70» Альгімантаса Кунчаса, даўно прызнанага мэтрам літоўскай фатаграфіі. Творы разьмешчаны ў Нацыянальным музэі Літвы; бадай, упершыню такія прэстыжныя залі аддадзены пад пэрсанальную мастацкую выставу фатографа. Але Альгімантас Кунчас адназначна заслугоўвае таго.

Гледачам ён прапануе свае даўнія і менавіта таму найбольш каштоўныя творы з краявідамі Вільні. Вядома, у асноўным гэта Стары горад, які неаднойчы фатаграфаваўся. Але Кунчасавы здымкі асаблівыя — настраёвыя і тонка-мастацкія. Найбольш кранаюць замалёўкі Вербнай нядзелі каля Вострай Брамы. Гэта душэўнае

Альгімантас Кунчас, «Вербная нядзеля каля Вострай Брамы».

местачковае сьвята. Жывыя вербы з «кашэчымі лапкамі», простыя людзі, якія далучыліся да сьвята.

Для тых, хто бываў на гэтым сьвяце апошнія гады, будзе асабліва заўважны кантраст гісторыі. Цяпер гэта сапраўднае мора людзей, складаных і пышных вербаў, выраблених з мастацкім густам, сотні турыстаў і гасьцей, якія імкнуцца ў гэты дзень у «горад-кірмаш», і амаль столькі ж майстроў і мастакоў, якія шукаюць шчасьця на гэтым амаль нацыянальным сьвяце народных рамёстваў…

Другі аўтар — сусьветна вядомы майстар са Швэцыі Ленарт Олсан. Мастак пачаў свой шлях тэлеапэратарам і прадусарам кіно, аднак з часам зразумеў, што непаўторна губляе ў мінулым вобразы, асабліва блізкія яму. Так ён стаў фатаграфаваць — здымаць масты. На першы погляд, гэта спэцыфічная тэма можа падацца складанай і да таго ж незапатрабаванай, але творца зрабіў адкрыцьцё, якое ня можа ня ўразіць. Масты і масточкі з

Ленарт Олсан, «Great Haywood. Strafordshir, England. 1991».

усіх куткоў зямлі сфатаграфаваныя ў такіх нязвыклых для чалавека ракурсах, так пяшчотна апрацаваныя аўтарам пры друку, што пераўвасобіліся ў жывых экстравагантных істот. Масты Олсана сталі самастойнымі мастацкімі творамі, а некаторыя зь іх наагул ня маюць нічога супольнага з мастамі, якія першапачаткова натхнялі творцу. Але вось зь любоўю занатаваныя масты Вэнэцыі ці Ангельшчыны прыгожыя самі па сабе, і фатограф толькі дапамог пабачыць гэта на ўласныя вочы тым, хто раптам ня зможа сам прайсьціся па ўсіх мастах у сьвеце.

Дзяніс Раманюк, Вільня

Лучанок судзіцца зь «Песьнярамі»

Ігар Лучанок і Сьвятлана Пенкіна падалі ў суд на стваральніка сайту «Песьняроў» Хведара Караленку.

Як паведаміў сп.Караленка, на думку кампазытара і апошняй жонкі Ўладзімера Мулявіна, сайт pesniary.com распаўсюджвае незаконным чынам творы «Песьняроў» і парушае аўтарскія правы. Сайт паўстаў шэсьць гадоў таму, у яго форумах неаднаразова бралі ўдзел былыя «Песьняры», а ў 2002 г. ён атрымаў «Рок-карону» як найлепшы праект. Караленка сабраў унікальны матэрыял пра ансамбль (рэдкія песьні, дыскаграфія, інтэрвію, фатаздымкі) і акром як падзякі ад усіх, хто меў нейкае дачыненьне да «Песьняроў», да гэтага моманту ня чуў.

«Пакрыўджаныя» падалі заяву з просьбай разабрацца ў Адміністрацыю прэзыдэнта, і гэтым заняўся Аддзел па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі — пэўна, мяркуюць, што Караленка пры дапамозе «Песьняроў» узьбіўся на небыякія грошы. Праект мог папросту «патрапіць пад раздачу», бо Лучанок зь Пенкінай вырашылі змагаецца з распаўсюдам неліцэнзійнай «песьняроўскай» прадукцыі. Караленка намагаўся неяк дамовіцца зь імі ды патлумачыць, што гэта праект на энтузіязьме. Канструктыўнага дыялёгу ня выйшла.

Суд прызначаны на 23 красавіка. Стваральніку сайту пагражае адміністрацыйнае пакараньне. У выпадку гэтага, кажа Караленка, ён адмовіцца ад далейшай падтрымкі праекту.

Сяргей Будкін

Фонд Быкава

Грамадзкі камітэт па ўшанаваньні памяці Васіля Быкава пры Саюзе пісьменьнікаў стварае Фонд імя Быкава. Пакуль што на 80-годзьдзе пісьменьніка заплянаваныя толькі адкрыцьцё аўдыторыі імя Быкава ды навуковая канфэрэнцыя ў БДУ. Фонд жа патрэбен, каб паставіць помнік пісьменьніку, павесіць шыльды ў ягоны гонар і выдаць поўны збор твораў. Пакуль жа таварыства «Кніга» выпусьціла 4-е выданьне мэмуараў «Доўгая дарога дадому». Агульны наклад успамінаў ужо дасягнуў 11 тыс. асобнікаў. Рыхтуецца расейскае выданьне ў перакладзе Валянціна Тараса.

Тым часам актывісты гарадзенскіх грамадзкіх арганізацыяў плянуюць сёлета ўсталяваць мэмарыяльную дошку на доме, у якім жыў Быкаў, а таксама стварыць музэй пісьменьніка.

Залаты мэдаль Асьлюку і Хашчавацкаму

Стужкі Віктара Асьлюка «Мы жывём у краі» ды Юр'я Хашчавацкага «Каўкаскія палоньнікі» атрымалі прыз «Залаты мэдаль Бялграду» на Бялградзкім фэстывалі кароткамэтражных і дакумэнтальных фільмаў. Праца Асьлюка ўганараваная таксама прызам кінакрытыкаў і журналістаў. Аднак у Беларусі фільмы Асьлюка й Хашчавацкага пабачыць цяжка: па тэлеканалах іх не паказваюць.

Дом кіно ў «Партызане»

Дом кіно адкрыецца ў ліпені ў кінатэатры «Партызан». У ім будзе заля на 600 месцаў. Чырвоны касьцёл, дзе месьціўся Дом кіно, на пачатку 90-х перадалі каталікам. Будынак на вул.Маркса ў кінэматаграфістаў летась забрала Кіраўніцтва спраў прэзыдэнта.

АВ; БелаПАН, Gazeta.pl

Палута ці Ларыса?

«Магчыма, гэта не Палута Бадунова, але дакладна не Ларыса Геніюш», — кажуць спэцыялісты-музэйшчыкі. «На адвароце здымку быў подпіс «Ваша Ларыса», — даводзіць мастак Уладзімер Крукоўскі. «Гэта Бадунова, мы кансультаваліся з навукоўцамі», — сьцьвярджае Ўладзімер Арлоў. Хто выяўлены на таямнічым здымку?

Пасьля выхаду «НН» № 9'2004 у Рэдакцыю прыйшоў ліст. Уважлівы чытач заўважыў: здымак, падпісаны «Палута Бадунова», цалкам адпавядае партрэту Ларысы Геніюш, зробленаму мастаком Алесем Марачкіным.

Здымак Палуты Бадуновай быў узяты для газэты з кнігі Ўладзімера Арлова і Зьмітра Герасімовіча «Краіна Беларусь». Да аўтараў гэтага грунтоўнага, багата ілюстраванага выданьня мы і зьвярнуліся па тлумачэньне. Уладзімер Арлоў пацьвердзіў, што здымак насамрэч падаваўся спрэчным, але пасьля кансультацыі з навукоўцамі рэдкалегія схілілася на карысьць таго, што на картачцы Палута Бадунова.

Зь іншага боку, мастакі Алесь Марачкін ды Ўладзімер Крукоўскі лічаць, што нават пры павярхоўным параўнаньні вядомых здымкаў Ларысы Геніюш і Палуты Бадуновай робіцца зразумела, што на спрэчнай фатаграфіі хутчэй выява паэткі. Бадунова, паводле слоў спадара Крукоўскага, мела спэцыфічныя рысы твару, якія надавалі ёй падабенства да расейскай паэткі Ганны Ахматавай. Гэтага не заўважна на спрэчным здымку. Да таго ж, як кажа У.Крукоўскі, на адвароце картачкі быў подпіс «Ваша Ларыса». На жаль, копія здымку страчана. Месца знаходжаньня арыгіналу невядомае.

Мы зьвярнуліся па кансультацыю да спэцыялістаў Архіву-музэю літаратуры і мастацтва. Пры разглядзе здымкаў Ларысы Геніюш удалося выявіць характэрныя рысы: ямка на падбародзьдзі і даўгаватая лінія рота. Гэтага не відаць на спрэчным здымку. Да таго ж, вопратка жанчыны, паводле слоў дырэктаркі музэю Ганны Запартыкі, адпавядае модзе 1910-х гадоў. Ларыса тады была маленькай дзяўчынкай, а Палута мела ўжо больш за дваццаць гадоў. Аднак на спрэчным здымку не заўважна таксама характэрнай для Бадуновай гарбінкі на носе. Зрэшты, ці мае наяўнасьць ямкі на падбародзьдзі і гарбінкі на носе вырашальнае значэньне? Прафэсійны фатограф з дапамогай адпаведна пастаўленага сьвятла здольны нівэляваць дробныя «хібы» твару. Вэрдыкт спэцыялістаў музэю такі: «Магчыма, гэта не Палута Бадунова, але дакладна не Ларыса Геніюш».

Такім чынам, застаецца загадкай, чыя выява на таямнічым здымку. Хто пакінуў нашчадкам на адвароце какетлівы надпіс «Ваша Ларыса», дасюль невядома. Магчыма, высьветліць лёс гэтага здымку, згубленага ў цёмных закутках гісторыі, па сілах Вам.

Арцём Лява

Прапанова да сходу інтэлігенцыі

Слушнымі, на жаль, ёсьць назіраньні пра «беларускі слоўны панос» у №14 «НН». Ня тое каб ня хлусілі раней, але ідэалягічная кампанія нечувана распусьціла языкі ахвотных да дэмагогіі. Дастаткова паглядзець які «Пастскрыптум», пачытаць якую «газэту для народу, для кожнага з нас»... Трэба ўжо нешта рабіць, а то патонем у слоўным брудзе, як тая жабка ў малацэ. Пакуль на заклёны «праваабаронцы» Новікава будзе рэагаваць адно француская амбасада, яму й бяды няма. Во калі зь ім суседзі ў пад'езьдзе перастануць вітацца...

Чаму б на сходзе беларускай інтэлігенцыі не заснаваць пазапартыйны камітэт, які адсочваў бы факты публічнай хлусьні і дэмагогіі, даючы ім маральную ацэнку? Ясная рэч, крытыкаваць інтэлігенты мусяць і ўладны, і апазыцыйны дыскурсы. А пачаць варта было б з аналізу заяў цяперашніх дэпутатаў палаты прадстаўнікоў: з чым яны ішлі ў парлямэнт, што выканалі, дзе спудлавалі. Для ўдумлівага чалавека занятак больш чым актуальны — год выбараў, як-ніяк.

Максім Доўгі, Менск

Рускае сяло

Прачытаў у адной дзяржаўнай газэце рэпартаж зь вялейскае вёскі Рускае Сяло. Журналістка шукала там сьлядоў расейскасьці (да «дня яднаньня народаў Беларусі й Расеі», дарэчы) — і не знайшла. А ад чаго такая назва, ніхто ня ведае, піша. Ну, ды гэта не перашкодзіла ёй расхадзіцца пра роднаснасьць і пераплеценасьць нашых добрых народаў-суседзяў.

Гэтак мова і гістарычныя міты блытаюць людзей! Да XX ст. ніхто ў Беларусі не называў расейцаў «рускімі». «Рускія» — значыла праваслаўныя, а яшчэ даўней — жыхары ВКЛ славянскага паходжаньня, беларусы і ўкраінцы. І процівастаўляліся «рускія» «русінам» і «літвінам», г.зн. беларусам балцкага паходжаньня, а пасьля беларусам «польскае веры» і «маскоўцам» (расейцам). Расейцаў жа называлі яшчэ «маскалямі». Ня дзіва, што ў паўночна-заходняй Беларусі, дзе жылі пераважна нашчадкі балтаў, зьявілася Рускае Сяло — мусіць, дзе між балтаў асяліліся славяне. Так, па паходжаньні насельнікаў, называлі ў іншых мясцовасьцях вёскі Літвіны, ці Маскальцы, ці Лотва. Але ж расейскага ў Рускім Сяле нічога ня можа быць. Хіба што такія газэты прышчэпяць.

Іван Соўсаль, настаўнік, Менск

Пра польскія візы

Нядаўна, калі быў у Менску, зазірнуў пад польскую амбасаду й пабачыў там карціну найлепшых савецкіх часоў у краіне — сатэліце СССР. 100, а мо й 150 асобаў штурмавалі дзьверы консульскага аддзелу. Да закрыцьця заставалася недзе хвілін з трыццаць, але ніхто не зьбіраўся разыходзіцца. Пад амбасадамі Беларусі ў Польшчы такога ажыятажу няма.

Наша заходняя суседка адбрыкваласа ад увядзеньня візаў, як кажуць, рукамі й нагамі, нават распрацоўвала нейкія там пагадненьні, каб увогуле зьняць візавыя напругі з краінаў-суседзяў. Але наша кіраўніцтва ні на ёту не саступіла палякам, тады як Украіна ў аднабаковым парадку ня стала ўводзіць візаў для іх. Бо ўкраінцы разумеюць значнасьць заходніх інвэстыцый. Асаблівы статус для атрыманьня візаў дастаўся грамадзянам Калінінградзкае вобласьці: ім таксама, як і ўкраінцам, візы задарма.

Я разумею, што нельга цяпер уводзіць нейкія там абмежаваньні накшталт візаў паміж Беларусяй і Расеяй, але памежны кантроль мусіць быць. Мы губляем вельмі шмат, маючы бескантрольную ўсходнюю мяжу. Гэта і нелегальная міграцыя, і крымінальны капітал, і наркотыкі. Увядзеньне памежнага кантролю з Расеяй дазволіла б заашчадзіць грошы.

Затое можна было б увогуле ня ўводзіць візаў для польскіх грамадзянаў, а таксама адмяніць іх у адносінах да грамадзянаў ЭЗ. Апошнімі гэтае было б расцэнена як крок да паляпшэньня адносінаў. Мы ж ходзім да тых, у каго хочам нешта прасіць, а не яны да нас.

Міраслаў Сакольскі, poczta.onet.pl

Неразумная фраза на СТВ

2 красавіка з праграмы СТВ даведаўся, што «Беларусь называюць маленькай Расеяй». Што да мяне, дык я ніколі раней такога ня чуў. З параўнаньня «маленькая Расея» вынікае, што нас пакуль адасабляюць ад Расеі, але ўжо атаясамліваюць зь ёй. Прызвычайваюць грамадзкую думку да расейскасьці нашай дзяржавы. Такое выказваньне мае антыбеларускі падтэкст.

Памятайма: з маленькага вырастае вялікае! Будзьма пільныя!

Ігар Хаменка, Менск

Слуцак прачынаецца

Калісьці Слуцак славіўся сваім духам незалежнасьці. Усім вядомы Слуцкі збройны чын. Але з таго часу шмат што зьмянілася, дый ня ў лепшы бок. Цяперашні стан сьвядомасьці адлюстроўвае становішча зь беларускімі незалежнымі газэтамі: «Наша Ніва» ў 7 шт., «Наша слова» ў 5 шт. І вось, здаецца, зь вясной пачала прачынацца слуцкая дрыгва. Праведзена невялічкая акцыя да Дня Незалежнасьці. Зроблена падпіска на «НН» і «НС» усіх школьных бібліятэк (у Слуцку 12 школ) і бібліятэк трох вучылішчаў.

Будзем спадзявацца, што газэты дойдуць да чытача.

Сяржук Кут, Слуцак

Да дыктатуры нам далёка

Здрабнеў цяпер дыктатар. Не зьмяніўшы летазьлічэньня ад дня свайго нараджэньня, не аб'явіўшы сябе сынам Бога, не напісаўшы кнігі, што замяніла б сабой Біблію, не зьмяніўшы назваў месяцаў і не паставіўшы на цэнтральнай плошчы сталіцы залатога помніка сабе любімаму, можна ўвайсьці ў сьпіс тыранаў.

Увогуле, дыктатараў пара заносіць у Чырвоную кнігу. У 1985 г. арэал іх расьсяленьня складаў 60% дзяржаў плянэты, цяпер зьменшыўся да 38%. Паводле зьвестак праваабарончай арганізацыі «Freedom House», на Зямлі засталося толькі 49 дыктатарскіх краін і іх колькасьць зьмяншаецца. Таму й маем, што ў першай дваццатцы вялікіх дыктатараў сучаснасьці фігуруе і наш ППРБ. Беларусь — адзіная краіна ў Эўропе, дзе захаваўся недэмакратычны палітычны лад. Вось дзеля геаграфічнага каляруту і ўлучаюць Лукашэнку ў гэтыя рэйтынгі поруч з Кім Чэн Ірам і Ніязавым. Але будзьма рэалістамі — да сапраўднай дыктатуры нам яшчэ вельмі далёка. Мы свабодна выяжджаем за мяжу, замежнікі свабодна прыяжджаюць да нас, у нас ёсьць апазыцыйныя партыі і газэты, ніхто ня глушыць замежнага радыё. Мы жывём не ў дэмакратычнай краіне, аднак гэта і не дыктатура. З аднолькавым посьпехам у рэйтынгі тыранаў побач з Лукашэнкам мог бы стаць Пуцін ці Кучма, але яны чамусьці заўжды «пралятаюць» чыстымі. Я не заступаюся ні ў якім разе за Лукашэнку, я заступаюся за краіну, за яе аўтарытэт у сьвеце. Згадзіцеся, ня вельмі ж ён высокі, калі мы стаім побач з Экватарыяльнай Гвінэяй і М'янмай. А гэта насамрэч засмучае...

Адну заўвагу хацелася б зрабіць для рубрыкі «Мова-2004». Ня варта ўжываць на старонках «НН» слова «бомж». Як вядома, гэтае слова ўтварылася ад скарачэньня расейскага выразу «без определённого места жительства». У беларускай мове ёсьць шмат адпаведнікаў нянаскаму слову. Напрыклад, «бесхацінец», «беспрытульны», «бадзяга».

Зьміцер Панкавец, Кастрыца

Аналітычны праект

Вядучыя беларускія палітолягі, правазнаўцы, эканамісты, сацыялёгі, спэцыялісты ў галіне адукацыі напісалі гэтую кнігу, каб напоўніць жывым зьместам малапрадметны выраз «Эўрапейскі выбар для Беларусі». Калі Вы хочаце ведаць, у якім стане цяпер знаходзяцца беларуская палітычная, эканамічная, сацыяльная і адукацыйная сыстэмы, і што трэба зрабіць зь імі, каб Беларусь сталася паўнапраўным чальцом Эўрапейскага Зьвязу, то гэтая кніга для Вас.

Беларусь: сцэнары рэформаў

Даслаўшы на адрас 220018, Менск, а/с 3 замову з пазначэньнем Вашага імя, імя па бацьку і прозьвішча, а таксама дакладнага адрасу, Вы атрымаеце кніжку бясплатна.

Сяргей Альфер, Зьміцер Бабіцкі, Валер Булгакаў, Уладзімер Валетка, Аляксандар Вашкевіч, Аляксандар Гатоўскі, Валер Дашкевіч, Андрэй Екадумаў, Максім Жбанкоў, Андрэй Завадзкі, Марына Загорская, Міхал Залескі, Уладзімер Калупаеў, Міраслаў Кобаса, Сьвятлана Крупнік, Юрась Ліхтаровіч, Андрэй Ляховіч, Уладзімер Мацкевіч, Пётра Натчык, Аляксандар Палоньнікаў, Міхаіл Пастухоў, Міхась Пліска, Віталь Сіліцкі, Віктар Чарноў, Андрэй Шабуня

Беларусь: сцэнары рэформаў.
Варшава: Фонд імя Сьцяпана Батуры, 2003.

Старая і новая «Эўропа»

У Менску на загад Лукашэнкі адновяць гатэль, дзе засядаў урад БНР. Праўда, не на тым месцы.

У беларускай сталіцы помнікі руйнуюць, а пасьля адбудоўваюць. Першым прыкладам, яшчэ за савецкім часам, стала аднаўленьне палацыка Ваньковічаў, што быў перад тым зьнесены. Затым каталікі ўзнавілі сваю катэдру, дакладней, яе шыкоўны фасад з імклівымі вежамі. Летась Менгарвыканкам зрабіў цудоўны прэзэнт гораду ў выглядзе імпазантнае ратушы. Тым часам на вуліцы Замкавай аднаўляюць самотны дамок «XIX стагодзьдзя»... Харашосьць ды й годзе! Павольна, але з паскарэньнем Менск набрыньвае «старасьвечнымі».

«Праектам нумар адзін» у рамках аднаўленьня Верхняга гораду абвешчаны гатэль «Эўропа». Гатэль, згодна з загадам Лукашэнкі гарадзкому начальніку Паўлаву, мае зьявіцца цягам двух гадоў і мець катэгорыю «пяць зорак». Проста гэтак і загадаў: аднавіць «Эўропу»! У вайну разбурылі, а мы адновім. За два гады.

Шматпакутная «Эўропа» й насамрэч была адным з самых яскравых знакаў Менску. Яе гісторыя сягае ажно ў XVIII ст., калі тут паўстала двухпавярховая камянічка. Затым гэтая гасьцініца належала сямейству Поляк. Хто тут толькі ні бываў! Стэндаль і Ян Чачот, дзекабрыст Мікалай Мураўёў ды мастак Язэп Пешка, які, дарэчы, і вывявіў гэты прыстанак падарожных на адной з сваіх акварэляў. Тутака спыняліся ці ня ўсе акторы ды музыкі, што гастралявалі ў Менску. Балазе, ушчыльную да гасьцініцы Поляка прымыкаў гарадзкі тэатар, на сцэне якога была пастаўленая нашая першая опэра «Ідылія», а насупраць, у Ратушы, таксама была тэатральная заля.

Пасьля пажару 1884 г. і рамонту гэтая гасьцініца набыла шыльду «L'Europe». Свой жа клясычны, ведамы нам зь дзясяткаў малюнкаў, карцінаў і фатаздымкаў вобраз у духу мадэрн гатэль набыў падчас капітальнае рэканструкцыі 1906—1908 г. Гэтак паўстаў самы вялікі цывільны гмах у тагачасным Менску. Тут быў пушчаны й першы ў нашым горадзе ліфт. «Эўропа» была ўзорам цывілізацыі.

Праз жалезныя карункі бальконаў «Эўропы» на Менск глядзелі тысячы людзей. Адсюль можна было назіраць за калейдаскопам акупацыяў і за ўрачыстасьцямі ў Дзень волі.

А мастак Натан Альтман пакінуў нам такі ўспамін, адзін з сваіх шэдэўраў: выгляд на менскую Саборную плошчу праз гаўбцовыя завітушкі. Карціна завецца «Правінцыйны горад» і месьціцца цяпер у Трацякоўскай галерэі ў Маскве. У 1918 г. у «Эўропе» на нейкі час разьмясьціўся ўрад БНР. Згадвае пра «Эўропу» і Сяргей Пясэцкі: дзеяньне авантурнага раману «Яблычак» адбываецца акурат у гэтай гасьцініцы.

Адбудова гэтага выбітнага помніка ў Менску безумоўна сьведчыла б пра многае. Пачынаючы ад назвы й сканчаючы традыцыяй. Гэта сьведчыла б і пра незваротнасьць пазытыўных зьменаў у стаўленьні да спадчыны. Гэта сьведчыла б і пра зьмены ў сьветапоглядзе ўладаў.

Каб і насамрэч адбудавалі б колішнюю «Эўропу» на яе падмурках, то яе гмах перакрыў бы ўсю пэрспэктыву вуліцы Леніна й цягнуўся б адным з фасадаў насупраць вітрынаў рэстарацыі «Крыніца» і аптэкі. Ну, і прыставіць да яго копію будынку колішняга гарадзкога тэатру не складала б праблемы. Тады Верхні горад ператварыўся б у замкнёны ансамбль, аддзелены ад савецкага Менску будынкам славутага гатэлю. Гэта была б рэвалюцыя ў сьведамасьці горадабудаўнікоў.

А цяпер давайце падумаем усур'ёз. Ці хто перарве просты шлях ад праспэкту Машэрава да Партызанскага? Ад Драздоў да праспэкту Скарыны? Для чаго ж толькі што пашырылі тут праезныя палосы за кошт бульвару? Каб і гатэль паставіць, і трасу захаваць, давялося б пракапаць падземны шляхаправод ніжэй узроўню мэтрапалітэну. Ці рэальна?

Ідэю аднаўленьня старога гатэлю падкінуў нібы яшчэ Чадовіч, былы галоўны архітэктар сталіцы, які ўжо не ў фаворы. Тым ня менш ідэю агучыў Лукашэнка. Відавочна, ягоная занепакоенасьць лёсам «Эўропы» з таго ж шэрагу, што й знаёмства з паэзіяй Васіля Быкава. Затое тыя, хто прапіхвае свой праект, падкідае свае інсынуацыі недасьведчанай публіцы, ведаюць, што робяць.

Цікава, што за два кварталы ад будучай «Эўропы» пабудаваны паводле праекту Ўладзімера Тарноўскага гатэль з працоўнай назваю «Новая Эўропа». Некаторыя яго элемэнты скапіяваныя з старой «Эўропы». Аднак вось ужо гадоў пяць муляе вока недабуд за драўляным плотам. Стаіць ён на вуліцы Інтэрнацыянальнай, бліжэй да Гарадзкога Валу. Ужо й ніхто ня памятае, хто ж быў замоўцам гэтага фэшэнэбэльнага гатэлю ў найпрэстыжнейшым месцы сталіцы. Будоўля, што разьляглася ўглыб старасьвецкае забудовы, «завісла». Засталося толькі скончыць інтэр'еры й прыбудаваць шкляны хмарачос у дварах. Як тут скончыш без Лукашэнкі пяцізоркавы гатэль у гістарычным цэнтры? Як бы чаго ня выйшла… Таму трэба, каб ініцыятыва зыходзіла ад яго самога.

Паколькі ідэя, што авалодвае масамі, становіцца матэрыяльнай сілаю, знайшліся яшчэ праектанты. Напрыклад, Аляксандар Грэчын, якому даўно карціць забудаваць рог Інтэрнацыянальнай і Леніна, ад брандэмаўэру Кансэрваторыі да брандэмаўэру дому па Леніна. Гэта зусім ня там стаяў гатэль «Эўропа». Там стаяў старасьвецкі гарадзкі тэатар, нават падмуркі якога ўзятыя пад ахову. Але як выконваць загады — дык выконваць… І не бяды, што не на тых месцах і ня ў тых маштабах. Галоўнае — пераканаць публіку. Пагатоў, сам Лукашэнка тым заняўся: зрабіць «Эўропу»! За два гады. Гэткім чынам, у старым Менску замест аднаго гатэлю «Эўропа», магчыма, будзе два! Што ж, у краіне, дзе ёсьць дзьве сацыял-дэмакратычныя партыі, дзьве камуністычныя й нат два БНФы, гэта мала каго зьдзівіць.

Сяргей Харэўскі

1908 год. Гатэль «Эўропа» на Саборнай плошчы.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тамсама, 2004 год.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Будоўля новай «Эўропы», што разьляглася ўглыб старасьвецкае забудовы на вуліцы Інтэрнацыянальнай, «завісла».

КАМЭНТАРЫ

Кіраўнік Менскага таварыства аховы помнікаў УЛАДЗІМЕР ДЗЯНІСАЎ мяркуе, што аднаўляць гатэль «Эўропа» неабходна толькі разам з будынкам гарадзкога тэатру: «Яны стваралі адзіны архітэктурны ансамбль. У праектным інстытуце «Менскградо» сваім часам распрацавалі архітэктурнае рашэньне для пляцу Волі: зрабіць пад зямлёй тунэль ад праспэкту Скарыны да праспэкту Машэрава. Тады пляц Волі можна было б зрабіць пешаходнай зонай», — кажа Дзянісаў.

Гісторык ЗАХАР ШЫБЕКА, аўтар кнігі «Менск. З гісторыі дарэвалюцыйнага гораду», ухваляючы ідэю рэстаўрацыі Верхняга гораду, лічыць аднаўленьне «Эўропы» праектам палітычна матываваным: «Могуць быць і больш вартыя ідэі, напрыклад Менскі замак. Калі б удалося аднавіць драўляна-земляны крэмль, да нас бы валам валілі турысты. Цагляныя крамлі шмат дзе ёсьць, а такога няма. Пры сучасных тэхналёгіях аднавіць было б не складана».

Зь Беларусі – у Эўропу

Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў, што сёлета сканчаюць 7—9 клясы сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюцца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзамэнаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыблена, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія.

Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі.

Распрацоўваюцца пляны стварэньня прыватнага Беларускага гуманітарнага ліцэю, у якім змогуць займацца навучэнцы ліцэйскіх курсаў, а таксама арганізацыі навучальнага працэсу за мяжой. Выпускнікі Ліцэю будуць мець магчымасьць атрыманьня бясплатных стыпэндыяў на навучаньне ва ўнівэрсытэтах эўрапейскіх краінаў.

Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59.

Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасьв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.

Падарожжа праз Вялікі Ўсход

«Усход — гэта штосьці, чаго ніхто ня хоча. На Захадзе Польшчы кажуць — усход пачынаецца ў Варшаве. У Варшаве казалі: усход — гэта за Беластокам. У Беларусі будуць казаць: натуральна, захад краіны не параўнаць з русіфікаваным усходам! І гэтак далей, і гэтак далей будзе адсоўвацца той усход, ад Бэрліна да Масквы. Дакладней, не да самой Масквы, а да яе прыгарадаў, бо «Масква — гэта зноў такі сабе Захад». Аўтар гэтых словаў пешкі адолеў шлях ад Бэрліна да Масквы.

Калі ўлетку 2001 г. Вольфганг Бюшэр, рэдактар аддзелу рэпартажаў нямецкай газэты «Цайт», падзяліўся з калегамі сваім плянам, тыя толькі пакруцілі пальцам ля скроні: застанешся ляжаць дзе-небудзь у кювеце, ніхто й ведаць ня будзе, далей Польшчы ня дойдзеш дакладна. А па гэты бок Одры, наадварот, казалі: а, ясна, немцы заўжды ішлі гэтым шляхам.

І Бюшэр прайшоў, і напісаў кнігу, якая выйшла ў 2003 г. ды амаль адразу стала бэстсэлерам. У часе падарожжа Бюшэр пракрочыў усю Беларусь. У свой пэрсанальны акт пашырэньня Эўразьвязу ён прыўнёс усе тыпова нямецкія забабоны.

Як кожны пасьляваенны немец, ён чакаў дрэннага стаўленьня да сваёй нацыі. Канчаткова пераканаўся ў адваротным, калі пагаварыў з старым, які прадаваў на трасе яблыкі. Яго бацьку забілі немцы, але ён немцаў любіць: «Ён не маніў, ён нічога не хацеў ад мяне. Проста быў рады зноў пабачыць немца і ўзгадаць мінулае. Я быў так крануты, што ня змог нічога сказаць. Мы кіўнулі, і я пайшоў». А ў Хвойніцкім краязнаўчым музэі дырэктар настойліва жадаў падарыць Бюшэру каску нямецкага салдата і чэрап таго самага салдата: дзіркі ад куляў супадалі. Не разумеў, чаму госьць адмаўляецца ад такога падарунку.

Як кожны немец, Бюшэр шукаў «іншых» гісторый вайны — гісторый пра шляхетныя паводзіны салдатаў вермахту. Спадарыня Ліза Гутковіч зь Менску распавяла яму гісторыю сваёй сяброўкі: тая зь Нямеччыны трапіла ў менскае гета, выратаваў яе нямецкі салдат. Яны зьбеглі да партызанаў разам, але ў хуткім часе немца згнаілі ў органах.

Дзень прэзыдэнцкіх выбараў, 9 верасьня 2001 г., Бюшэр прабыў у лазьні, у лазьні ж быў і дзейсны прэзыдэнт краіны — прынамсі, так паказвала тэлевізія. А пра тэракт 11 верасьня Бюшэр дазнаўся ў віцебскай сталоўцы. Пабачыў перад тэлевізарам купку людзей, што назіраюць за абвалам дзьвюх вежаў-хмарачосаў. Не разумеючы мовы, не адразу ўцяміў, што адбылося. Па беларускіх каналах у гэты момант — бітва за ўраджай.

Калегі папярэджвалі Бюшэра, што Беларусь — сумная і стомленая краіна. Такою ён яе і ўбачыў. «Успаміны — гэта, разам з драўнінай, адзіная экспартаздольная прадукцыя гэтай краіны, і з Захаду, дзе матэрыял усё дэфіцытнейшы, ехалі журналісты, сцэнарысты, пісьменьнікі, каб зжаць яго тут. Так, Усход — гэта магіла гісторый, радовішча трагічнага, матэрыял ляжыць глыбока пад дзірваном, сапраўды сыры, неапрацаваны, неадшліфаваны. У сваёй амаральнай прыгажосьці ён мае больш супольнага з мудрагелістымі сагамі, чым з маралісцкімі казкамі».

Кніга Бюшэра цікавая сьвежасьцю высноваў, якія ён, староньні назіральнік, рабіў, углядаючыся ў беларускую штодзённасьць. Ноччу на галоўнай плошчы ў Наваградку: каротка стрыжаныя маладзёны з шнарамі на твары і разьбітымі губамі, дзеўкі з лакі-страйкам у роце, бутэлькай кокаколы ў руках і прагай жыцьця ў вачах. «Баявы стыль кароткіх стрыжак знойдзеш ва ўсіх пасьляваенных гарадах, у Сараеве і Пнампені, Караляўцы — ва ўсіх гарадах, дзе вайна прайшла шмат гадоў таму, але так і ня скончылася. Гэта твар часу паміж радыкальным «пасьля таго» і няясным «перадчым-жа». У Бэрліне такія стрыжкі — папросту павеў моды, тут жа, наадварот, прычына худзізны — сьціплае харчаваньне, шнараў — працы ў полі альбо бойкі, а грубасьць — непадробная».

Менск падаўся яму грандыёзнай дэкарацыяй, падрыхтоўкай да прэм'еры. Аўтару здаецца, што ён тут, каб пакаяцца ў ідэалягічных грахах сваёй маладосьці. «Аднойчы вечарам сам адзін, у камунізьме, на вялікай дзяржаўнай сцэне запаведніка». Беларусы, піша ён, не глядзяць у вочы падчас размовы, не разумеюць яго, замежніка, — як людзі зь іншым жыцьцёвым досьведам, зь іншымі жаданьнямі. Абавязковая цырымонія падчас знаходжаньня ў Менску — наведаньне Макдональдза. Дзеля прыбіральняў. Гэта найлепшыя ў горадзе прыбіральні, параўнальныя толькі з прыбіральняй у Інстытуце імя Гётэ: «Ня ведаю, якое нямецкае пасланьне — бібліятэка інстытуту альбо яго прыбіральня — больш дзейснае».

Адным з найбольшых перажываньняў для нямецкага журналіста была вымушаная галадоўка. Часам цэлы дзень у дарозе, ён ня меў дзе паесьці, таму перабіваўся вадой і чакалядкамі.

Яшчэ Бюшэр устанавіў, што ён адногадак з горадам Жодзінам (1951 г.), а, выйшаўшы зь Менску, праілюстраваў свае ўражаньні словамі клясыка — цытуе «Нашу бедную старонку» Якуба Коласа (1906 г.):

Край наш бедны, край наш родны!
Лес, балота ды пясок...
Чуць дзе крыху луг прыгодны...
Хвойнік, мох ды верасок.

Недзе пад Крупкамі сялянка прапаноўвала яму папрацаваць на полі — выбіраць бульбу. «Што, ня любіш працаваць?» — пыталася яна. Ён працы не баяўся, баяўся працягу. І зусім не аціаніў таго, што супольнае выбіраньне бульбы — найвышэйшая ступень інтымнасьці, і абы-каго сялянка на поле не пусьціла б.

Першая рэцэнзія на кнігу Бюшэра выйшла ў «Звяздзе» (Леанід Лахманенка, «Не бадзяўся б ты, немец, пад чужым плотам»). Па добрай традыцыі аўтар рэцэнзіі кнігі не чытаў. А таму абураўся: маўляў, прачытаўшы кнігу Бюшэра, людзі могуць прыйсьці да высновы, што Беларусь — «малаадукаваная краіна з даступнымі для кожнага іншаземца жанчынамі». На жаль, Л.Лахманенка быў уведзены ў зман рэцэнзіяй, паводле якой ён пісаў сваю рэцэнзію. Аўтар так і не скарыстаўся з паслугаў «даступных для кожнага іншаземца» жанчын. Прынамсі, так вынікае з кнігі. Наадварот, давялося амаль што абаранятца ад навязьлівых прастытутак: у сталічным гатэлі «Беларусь» прапановы паступаюць праз тэлефон, а таксама ў пакоі — на аркушыках з школьных сшыткаў, напісаныя бадай дзіцячым дзявоцкім почыркам. Калі немец не адгукнуўся на прапановы, яму паўночы грукалі ў дзьверы.

Вераніка Дзядок

Вольфганг Бюшэр: «У Хвойніцкім краязнаўчым музэі дырэктар настойліва жадаў падарыць мне каску нямецкага салдата і чэрап таго самага салдата: дзіркі ад куляў супадалі. Не разумеў, чаму я адмаўляюся ад такога падарунку».

Пра багоў і людзей

Кніга францускага лінгвіста й сэміётыка А. Грэймаса, літоўца з паходжаньня, разгортвае перад чытачом складаны сьвет літоўскай міталёгіі, якая, нягледзячы на супольны гістарычны лёс і роднасьць нашых народаў, дагэтуль заставалася малавядомай у Беларусі.

Дэманструючы зайздроснае веданьне і разуменьне першакрыніцаў, выкарыстоўваючы мэтадалягічныя здабыткі францускіх культуралягічных школаў, А.Грэймас у першай частцы працы ўзнаўляе аб'ёмную мадэль літоўскага сакральнага быцьця, дзе міталягічныя пэрсанажы (Каўкасы і Айтварасы, Аўшрыня і Лайма, Дэйвілы і інш.) выглядаюць дзейснымі суб'ектамі даўняй этнічнай гісторыі, кожны зь якіх займае сваё месца ў гіерархіі Сусьвету і мае свой тып стасункаў з чалавечым сьветам. Для дасьледчыка літоўская міталёгія — «вобразная форма выяўленьня культуры», «сьведчаньне агульнай этнічнай памяці», урэшце — «нацыянальная рэлігія», а той парадак і гіерархія, што існуюць у мітах паміж багамі, ёсьць адлюстраваньнем гэтага ж парадку й на зямлі сярод людзей.

Другая частка дасьледаваньня ўтрымлівае «апісаньне характару, жыцьця і ўчынкаў сувэрэнных багоў: Багоў Гаспадароў». Аналізуючы зьвесткі пра Совія, «павадыра душаў», Пяркунаса, Вяльняса і інш., аўтар даводзіць, што апроч сакральнай (нечалавечай) сфэры, гэтыя багі зьяўляюцца дзейснымі суб'ектамі зямной гісторыі, чыньнікамі этнічнай кансалідацыі.

Знаёмячыся з палатном літоўскай этнічнай культуры, мы асуджаныя праводзіць паралелі і задаваўца пытаньнямі. Напрыклад, чаму ў айчыннай гісторыі культуры яе «пачаткі» прынята сумяшчаць з хрысьціянізацыяй, заснаваньнем япархій ды кляштараў — справамі відавочна ўнівэрсалісцкага толку, у той час як «нацыянальная рэлігія» (=міталёгія) — фэномэн унікальны і непаўторны — разглядаецца як нешта маргінальнае, ня вартае ўвагі?

На жаль, беларускім дасьледчыкам няма чаго прапанаваць блізкага па ўзроўню да кнігі А.Грэймаса, хоць беларускі матэрыял тыпалагічна тоесны зь літоўскім. Прычына ў тым, што нашы дасьледчыкі, за рэдкім выключэньнем, кіруюцца састарэлымі мэтадалягічнымі прынцыпамі. Размова ідзе пра пазытывізм (у ягонай савецкай рэдакцыі) і «нэарамантызм». Пад прыкрыцьцём апошняга зьяўляюцца псэўданавуковыя кнігі, дзе асабістыя фантазіі аўтараў выдаюцца за прадукт мысьленьня нашых продкаў. Для такіх «дасьледаваньняў» характэрна неахайнасьць у адносінах да першакрыніц і ігнараваньне набыткаў сацыякультурнай антрапалёгіі.

Грэймас Альгірдас Юліюс. Пра багоў і людзей. У пошуках этнічнай памяці: Перакл. зь літ. Сяргея Шупы. — Менск, «Энцыкляпэдыкс», 2003.

Пазытывісцкі падыход палягае ў сьвядомай прафанацыі рытуальных асноваў беларускай этнічнай культуры, і найбольш гэта характэрна для дасьледчыкаў-філёлягаў. Да прыкладу, укладальнік вядомага зборніка прыкмет і павер'яў лічыць, што «…дасьледчык народнай культуры павінен у тых жа самых забабонах, у той жа самай варажбе ўбачыць іх паэтычную сутнасьць, элемэнты гульні, розыгрышу, і тады будзе зразумелым імкненьне народу ажывіць, пацешыць сваё аднастайнае жыцьцё рознымі выдумкамі» («Зямля стаіць пасярод сьвету...», укл. У.Васілевіч). Такім чынам, усё, што складала грунт жыцьця, было ягонай матрыцай, гэты аўтар разглядае як «забабоны» і апускае на ўзровень пацех. Небясьпеку «філялягізацыі» міталёгіі падкрэсьлівае А.Грэймас: «Непаразуменьне ўзьнікае тады, калі фальклярыст… пачынае адначасна прэтэндаваць на ролю крытыка вэрбальнай літаратуры і апісальніка старажытнай… міталёгіі: гэта ўжо было б зьмяшэньнем навуковых жанраў».

Праца А.Грэймаса зьяўляецца для нас прыкладам высокага ўзроўню прафэсіяналізму і дасьледчыцкай этыкі. Аўтар ня лічыць заганным прызнаць «магчымыя недакладнасьці і памылковыя інтэрпрэтацыі». У той самы час практычна ўсе творы беларускіх «мітолягаў»-філёлягаў носяць катэгарычна-канчатковы характар, а крытыка разглядаецца аўтарамі як асабістая абраза.

Адзначым, што лягічны і даходлівы стыль кнігі Грэймаса ня толькі задавальняе рацыянальную запытлівасьць чытача, але і абуджае яго эмоцыі ды ўяўленьні, безь якіх запраўды немагчыма зразумець прыроду і лёгіку міта.

Уладзімер Лобач

• НОВЫЯ КНІГІ •

Выбраныя навуковыя працы акадэміка С.Некрашэвіча: Да 120-годзьдзя з дня нараджэньня. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 190 с. 1000 ас.

Выданьне дазваляе пабачыць праблемы беларускага мовазнаўства на этапе яго станаўленьня. Разам з выдадзенай летась кнігай Я.Лёсіка «Выбраныя працы...» складаюць каштоўную крыніцу ў дасьледаваньні гісторыі беларускага правапісу. У «Акадэмкнізе» цана 4320 руб.

Германовіч Я. Кітай—Сібір—Масква: Успаміны. — Менск—Санкт-Пецярбург: Неўскі прасьцяг, 2003. — 300 с. 1000 ас.

Знакамітая кніга айца Язэпа, упершыню выдадзеная ў Мюнхене ў 1969 г. Беларусвернік распавядае пра свой шлях на Галгофу. Шукайце на выставе Ўправы БНФ.

Запісы-27: Беларускі інстытут навукі й мастацтва. — Нью-Ёрк—Менск, 2004. — 432 с.

27-ы том «Запісаў» адкрываецца матэрыяламі, прысьвечанымі памяці Зоры Кіпель. Разьдзел «Тэксты» рэпрэзэнтуе артыкулы Ірыны Багдановіч «Беларуская паэзія 20-х гадоў як зьява літаратурнага авангардызму», Юр'я Гарбінскага «Беларускі рэлігійны друк на эміграцыі» й Натальлі Гардзіенкі «Беларусы ў Аўстраліі». У «Архівалії» зьмешчаныя артыкул Вацлава Пануцэвіча «Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква», лісты Зоські Верас да Апалёніі Савёнак, факсымільная публікацыя «Крыніцы» (1929—30 г.) — літаратурна-мастацкага часопісу Літгуртку Беларускага пэдагагічнага тэхнікуму, а таксама матэрыялы пра беларускія могілкі на эміграцыі. «Літаратура» падае «Запіскі й зацемкі» Янкі Юхнаўца.

Макмілін А. Беларуская літаратура дыяспары: Манаграфія / Пер. з ангельск. В.Бурлак, В.Жыбуля. — Менск: Тэхнапрынт, 2004. — 440 с. 700 ас.

Бригадин П., Лукашевич А. Военная школа в Беларуси: XVIII—первая четверть XIX вв. — Минск: Изд. центр БГУ, 2004. — 120 с.: ил. — (Scriptor universitatis). 1000 ас.

Дасьледаваньне прысьвечанае гісторыі вайсковай адукацыі й ахоплівае пэрыяд ад першых вайсковых школаў Рэчы Паспалітай да стварэньня на тэрыторыі Беларусі сеткі вайскова-навучальных установаў Расейскай імпэрыі.

Тацяна Вабішчэвіч

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

Бляндынка і вэтэрынар

«50 першых пацалункаў» («50 First Dates»)
ЗША, 2004, каляровы, 99 хв.
Жанр: камэдыйная мэлядрама
Адзнака: 3 (з 10)

Карціна з назваю «50 першых пацалункаў» не абяцае нічога сур'ёзнага — і абяцаньні свае выконвае з прафэсійнай годнасьцю прадмета аднаразовага выкарыстаньня.

Гавайскі курортны кавалер (Адам Сэндлер), а па сумяшчальніцтве марскі вэтэрынар і дасьледчык маржоў, знаходзіць дзяўчыну сваёй мары — шчасьлівую бляндынку (Дру Бэрымар). Шчасьце гераіні зьвязанае з тым, што кожную ноч прыгажуня забывае падзеі папярэдняга дня — пасьля аўтааварыі адбіла кароткатэрміновую памяць (такі сабе жаночы «Дзень сурка»). Уражаны лавэлас штораз па-новаму заляцаецца і нат зьбіраецца ажаніцца, але праз дзявочую слабасьць зрабіць гэта ох як няпроста.

Жарты ў фільме радуюць гледача сваёй чаканасьцю: маржовыя ваніты на мужападобнай асыстэнтцы, згадкі пра знакамітыя часткі маржовых целаў… Мэлядраматычныя моманты выглядаюць лепшымі. А эпізод, калі гераіня праглядае відэакасэту як уласную згубленую памяць, мо й намякне, што на экране ня толькі кінатавар. Але нам хутка дапамогуць гэта забыць.

Карціна можа быць прызначаная для лёгкага часазабойства.

Андрэй Расінскі

WWW.COUNTINGDOWN.COM

12+1 прыедуць у Горадню

26 красавіка на філфаку Гарадзенскага ўнівэрсытэту — літаратурнае кабарэ. Такую форму абралі арганізатары для творчай сустрэчы зь пераможцамі конкурсу маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай. Пачатак а 14-й. Вядуць спатканьне Ганна Кісьліцына й Андрэй Хадановіч.

Твор пра каханьне

2 траўня, у нядзелю, а 19-й у бібліятэчнай залі Дому літаратара (Фрунзэ, 5) адбудзецца творчая вечарына пераможцаў конкурсу маладых літаратараў імя Пэтраркі «Твор пра каханьне». Прагучаць новыя вершы, песьні, будуць і сюрпрызы. Пераможцы леташняга конкурсу маладых літаратараў будуць прэзэнтаваць свой зборнік «12+1». Вядуць Ганна Кісьліцына і Андрэй Хадановіч.

«NRM»: сустрэча з фэнамі

22 красавіка ў краме «Містэрыя гуку» (вул.Няміга, 12) з нагоды рэлізу таннай вэрсіі складанкі «Справаздача 1994—2004» адбудзецца аўтографсэсія музыкаў «NRM». Пачатак а 18-й.

Новая вэрсія дыску будзе розьніцца колерам (срэбным) вокладкі. Сярод іншых адрозьненьняў ад першага, «залатога» выданьня — адсутнасьць двух запісаў 1994 г. ды вялікай кніжкі з фатаздымкамі. На «срэбным» дыску застанецца галоўнае — дзьве новыя песьні ды 15 найлепшых за 10 гадоў.

Сяргей Будкін

Клюбнае жыцьцё

«Bronx»
вул.Варвашэні, 17/1, тэл. 288-10-61, GSM Velcom: 103 і 105.

23 красавіка (пт), 22.00 — «Apple Tea». Жывы гук.
24 красавіка (сб), 22.00 — Kid Loco (Францыя), dj IFU, dj Arsenti Tchouprina, dj Палёны, Іяляна (опэрны вакал), эквілібрысты, шоў фрыкаў.
28 красавіка (ср), 22.00, «N.C.» (джаз-трыё). Жывы гук.
29 красавіка (чц), 22.00, dj I.F.U.

«Hamillion»
па-за Менскам.

23 красавіка (пт), 23.00 — 6.00 — «Breaks Party»: DJ Anis (break-beat), DJ Vadim Key (funky break-beat, jazz-breaks), DJ Andy Dust (drum'n'bass). Дастаўка аўтобусамі туды і назад. Квіткі 15 тысяч, толькі на папярэднюю замову. Даведкі праз т.: 676-46-15.

«NC»
вул.Кастрычніцкая, 17, www.newclub.info.

23 красавіка (пт), 23.30—6.00 — «Спортлято». Дыскарэтра-рок-н-рол. Бяруць удзел Зэ Лэйся Сонг, dj Agry, MurzZzoid & F-Fader, Bob & Sley, DJ. V. S., DJ Міхалыч, DJ Gyps. Паказ мод ад «Second-Hand». Квіткі: 7000 з флаерам, 8000 бяз флаеру. Даведкі праз т.: 779-88-81.
24 красавіка (сб), 23.30—6.00 — «Электраабарона-2». Другая вечарына ў межах усебеларускага конкурсу кампутарнай музыкі. Бярэ ўдзел больш як 20 праектаў. Між тымі, хто загадзя набудзе квіткі, разыграюць інтэрнэт-картку правайдэру «IP-Telcom». Загадзя квіткі каштуюць 8000, тое ж з флаерам, інакш — 9000. Даведкі праз т.: 752-34-20.

«X-Ray»
вул.Інтэрнацыянальная, 27, тэл. 223-93-55.

23 красавіка (пт), 22.00 — dj Noche.
24 красавіка (сб), 22.00 — dj Палёны.
30 красавіка (пт), 22.00 — «Techno party». Вечарына з нагоды выхаду 10-й кружэлкі «ENERGUN-22» у Эўропе.

«Гудвін»
пр.Скарыны, 19, тэл. 226-13-06, 626-13-03.

23 красавіка (пт), 21.00 — «N.C.» (джаз-трыё).
24 красавіка (сб), 23.00 — «Танцпляцоўка СССР», dj Basic (Масква).

«Ямайка»
вул.Альшэўскага, 10, тэл. 252-07-26.

23 красавіка (пт), 22.00 — «Pre/after», dj Даша Пушкіна, dj Noche, dj Палёны.

Паводле mixtura.org, oxidiser.org, newclub.info

Тэатры і канцэрты

Купалаўскі тэатар
22 красавіка (чц) — «KIM»
24 красавіка (сб) — «Згублены рай»
25, 29, 30 красавіка (ндз, чц, пт) — «Каханьне ў стылі барока»

Малая сцэна
вул.Энгельса, 12

23 красавіка (пт) — летапіс каханьня «Салямэя»
24 красавіка (сб) — «Барух — Эмануэль»
26 красавіка (пн) — «Муж для паэтэсы»
28 красавіка (ср) — «Налу»
29 красавіка (чц) — японская гісторыя «Дом, дзе сьпяць прыгажуні». Апошні паказ

Опэра
22 красавіка (чц) — «Тоска»
24 красавіка (сб) — Вечар рамансаў
29 красавіка (чц) «Вясельле Фігара»

Балет
23 красавіка (пт) — «Жызэль»
30 красавіка (пт) — «Вясна сьвяшчэнная», «Карміна Бурана»

Музычны тэатар
22 красавіка (чц) — «Прынцэса цырку»
23 красавіка (пт) — «Дарагая Памэла»
24 красавіка (сб) — «Жызэль»
25 красавіка (ндз) — «Ноч у Вэнэцыі»
28 красавіка (ср) — музычнае шоў «Галяктыка каханьня»
29 красавіка (чц) — «Севастопальскі вальс»

Тэатар імя Горкага
Вялікая заля
22 красавіка (чц) — «Люці»
23 красавіка (пт) — «Тата, тата, бедны тата!..». Вечны трагіфарс
24 красавіка (сб) — «Дзівакі»
25 красавіка (ндз) — «Суцяшальнік удоваў» — фарс паітальянску ў 2-х дзеях
27 красавіка (аўт) — камэдыя «Вольны шлюб»
28 красавіка (ср) — «Калігула»
29 красавіка (чц) — рок-опэра паводле твораў А.Пушкіна «Анджэла і іншыя»
30 красавіка (пт) — гісторыя каханьня «Перад захадам сонца»

Малая заля
Пачатак спэктакляў у 18:30
27 красавіка (аўт) — «Пэрпэтум габрэйскай показкі»

Моладзевы тэатар
Т.: 289-32-62

22 красавіка (чц) — «Тайбэле і яе дэман»
24, 25 красавіка (сб, ндз) — «Страсьці ў Віндзоры»
29, 39 красавіка (чц, пт) — камэдыя паводле Пала Бэкеша «На вачох у жаночай берагавой аховы»

Моладзевы тэатар эстрады
Т.: 222-82-96

22 красавіка (чц) — праект «Легенды Вялікага княства» прэзэнтуе канцэртную праграму джаз-фольк гурту «Яваровы людзі»
24 красавіка (сб) — танцавальна-гумарыстычная праграма «Данс-гумар-шоў»
29 красавіка (ср) — у рамках «Фэсту эстраднага танцу» шоў-праграма «Танцы ў чырвоным»

Тэатар беларускай драматургіі
Т.: 234-60-08, 286-70-21

23, 24 красавіка (пт, сб) — гістарычная драма «П'емонцкі зьвер»
25 красавіка (ндз) — сцэны каханьня і нянавісьці ў «Балядзе пра Бландою»
26 красавіка (пн) — сумесны франка-беларускі праект «Чарнобыльская малітва»
29, 30 красавіка (чц, пт) — гісторыя каханьня «Адэль»

Менскі драматычны тэатар «Беларускія сэзоны»
Т.: 285-81-04, 775-81-04, 755-07-06

26 красавіка (пн) — камэдыя «Ці лёгка падмануць жанчыну»
28 красавіка (ср) — «Няма такой краіны — Галяндыя...»
29 красавіка (чц) — «Танга ўтрох»

Канцэртная заля Акадэміі музыкі
вул.Інтэрнацыянальная, 30

25 красавіка (ндз) — дзяржаўны камэрны аркестар Беларусі

Палац прафсаюзаў,
пр.Скарыны, 25

26 красавіка (пн) — музычная капэла «Санорус»

Канцэртная заля «Менск»,
вул.Кастрычніцкая, 5

27 красавіка (аўт) — лекцыя-канцэрт з сэрыі «Фрыдэрык Шапэн — паэт фартэпіяна». Тэма: «Прэлюдыі. Скерца. Экспромт. Саната». Творы Шапэна гучаць у выкананьні ляўрэатаў міжнародных конкурсаў, студэнтаў Акадэміі музыкі.
30 красавіка (пт) — ансамбль «Церам-квартэт», Санкт-Пецярбург (Расея)

Заля камэрнай музыкі Белдзяржфілярмоніі
22 красавіка (чц) — ансамбль «Клясык-авангард» з праграмай «Ад венскіх клясыкаў да джазу»
23 красавіка (пт) — ансамбль «Венскія салісты», Аўстрыя
24 красавіка (сб) — канцэрт арганнай музыкі
26 красавіка (пн) — «Ступені майстэрства» — канцэрт творчай моладзі
27 красавіка (аўт) — канцэрт гітарнай музыкі
29 красавіка (чц) — арганная і фартэпіянная музыка
30 красавіка (пт) — канцэрт камэрнай музыкі

Тэатар «Дзе-Я?»
Т.: 243-44-79

23 красавіка (пт) — «Квадратура кола»
27 красавіка (аўт) — «Жанчыне не забароніш»
28 красавіка (ср) — «Гарбата зь вярблюдам»
29 красавіка (чц) — «Шалёныя грошы»

Магілёўскі абласны драматычны тэатар
22 красавіка (чц), **29** (чц) у 16.30, **23** (пт), **24** (сб), **25** (ндз) у 18.30 — «Гэтыя вольныя мятлушкі»
28 красавіка (ср) — музычны вечар з ансамблем клясычнай і сучаснай музыкі «Весны настрой»
30 красавіка (пт) — «Прыходзь і зводзь»

Кінаафіша

«Аўрора» (253-33-60)
«Халодная гара» («Оскар-2004»): **23** (пт) 15.00, 17.50, 20.40; **24, 25** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.50, 20.40.
«Заплямленая рэпутацыя»***: **23—25** (пт—ндз) 19.00, 21.00.
«Бабуля»: **23** (пт) 17.00; **24, 25** (сб, ндз) 15.10 (іл), 17.00.
«Бярэсьце» (272-87-91)
«Монстар»**** («Оскар-2004): **23—25** (пт—ндз) 19.00, 21.10.
«Цяжкасьці перакладу» («Оскар-2004»): **23** (пт) 17.00; **24, 25** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.00.
«Кастрычнік» (232-93-25)
«50 першых пацалункаў» (прэм'ера): **23** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **24, 25** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
«Масква» (223-27-10)
«50 першых пацалункаў» (прэм'ера): **23** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **24** (сб) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **25** (ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
«Мір» (284-37-71)
«Халодная гара» («Оскар-2004): **23—25** (пт—ндз) 18.20, 21.00.
«Скарбы Амазонкі»: **23** (пт) 16.20; **24, 25** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.20.
«Перамога» (223-77-66)
«Каханьне паводле правілаў... і без» («Оскар-2004»): **23** (пт) 14.20, 18.50; **24, 25** (сб, ндз) 14.20 (іл), 18.50.
«Блубэры»: **23—25** (пт—ндз) 16.40, 21.10.
«Нядзеля за горадам» (Тыдзень французскага кіно): **25** (ндз) 12.30 (безь перакладу).
«Піянер» (227-64-87)
«Чумавая пятніца»: **23, 24** (пт, сб) 19.10, 21.00; **25** (ндз) 15.30, 19.10, 21.00.
«Актэбэль»: **23, 24** (сб, ндз): 17.10; **25** (ндз) 17.15.
«Цэнтральны» (227-34-16)
«Дом зь пяску і туману» («Оскар-2004»): **23** (пт) 14.00, 18.30; **24, 25** (сб, ндз) 11.00 (іл), 17.10.
«Нешчасьліўцы»: **23** (пт) 12.00, 16.30, 21.00; **24, 25** (сб, ндз) 13.30, 15.20, 19.40, 21.30.

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50%)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.

Юнаму гледачу

«Аўрора»
«Кевін у краіне Драконаў»: **23** (пт) 14.30; **24, 25** (сб, ндз) 13.00.
«Бярэсьце»
«Астэрыкс і Абэлікс: місія «Клеапатра»: **23** (пт) 15.00.
«Гэты нягоднік Сідараў»: **24, 25** (сб, ндз) 12.00.
«Мір»
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **24, 25** (сб, ндз) 12.00.
«Піянер»
«У пошуках Нэма»: **23** (пт) 12.00; **24** (сб) 10.20, 12.00; **25** (ндз) 10.20, 13.50.
«Дзеці шпіёнаў-2»: **25** (ндз) 12.00.

Купалаўскі тэатар
25 красавіка (ндз) — «Афрыка» (11.30)

Тэатар юнага гледача
Т.: 227-89-24
24 красавіка (сб) — у 11.00 і 14.00 дзетак з 6 гадоў запрашаюць на «Дзень нараджэньня ката Леапольда»
27 красавіка (аўт) — музычная казка-фантазія пра рыцарства, каханьне ў новым тысячагодзьдзі «Рыцар Ордэну Сонца». Для дзетак з 12 гадоў. Пачатак у 18.00
28 красавіка (ср) — дзяцей з 11 гадоў запрашаюць паглядзець сапраўдную гісторыю пра сьлепаглуханямую дзяўчынку і яе маладую настаўніцу «Тая, што зьдзейсьніла цуд»
29 красавіка (чц) у 16.00 і 30 красавіка (пт) у 14.00 — крыху сумная гісторыя з шчасьлівым канцом «Маленькі лорд Фаўнтлерой». Для дзяцей з 5 гадоў

Музычны тэатар
24 красавіка (сб) — «Айбаліт-2002»
25 красавіка (ндз) — «Бураціна.BY»

Тэатар імя Горкага
22 красавіка (чц) — «Джэльсаміна ў краіне хлусаў»

Тэатар беларускай драматургіі
25 красавіка (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй» (12.00)

Тэатар «Дзе-Я»
24 красавіка (сб) — «Чарадзейная скрыпка»

Магілёўскі абласны драматычны тэатар
25 красавіка (ндз) — музычная казка «Два клёны». Пачатак у 12.00

Ягайлавы дубы

Навакольнае асяродзьдзе драбнее з кожным пакаленьнем. А паколькі ўсё пазнаецца ў параўнаньні, ужо сёньня стогадовае дрэва для нас іграе ролю тысячагадовага: папросту параўноўваць няма з чым. Наяўны прыклад — нашае тысячагадовае Берасьце. Паспрабуйце знайсьці ў нашым горадзе хоць бы адзін варты прыродны цуд. А былі… і не адзін. На нашых вачах усё пайшло пад лязо сякеры. Дрэвы-гіганты нас ужо папросту палохаюць, зь імі міжвольна параўноўваецца і астатняе, а з гэтым астатнім — слаба. І каб ступень параўнаньня зьнізіць, чалавек, узброены мэханізаванай пілой, косіць усё налева і направа. Раскажу адну гісторыю пра дрэвы. Гэта здарылася ў 20-я гады мінулага стагодзьдзя, у гады вялікай эканамічнай дэпрэсіі, якая закранула і нашыя мясьціны.

АНАТОЛЬ КЛЫШЧУК

Гаворка пойдзе пра Ракавіцу, што за 20 км на поўнач ад Берасьця. Тэадор Талочка, сын Яна Талочкі, паўстанца 1863 г., апошні ўладальнік маёнтку ў Ракавіцы, у сваіх успамінах распавядае: «…Я мусіў выкарыстоўваць свае і без таго моцна павысяканыя лясы як крыніцу капіталу для набыцьця сельскагаспадарчага інвэнтару, насеньня і збожжа. З гэтай мэтай неабходна было высекчы некалькі сотняў тысячагадовых, улюбёных маіх дубоў з Раковіцкага парку, якія памяталі ня толькі караля Ягайлу, але яшчэ й Пяста. Шукаючы пакупнікоў, я натрапіў на гданьскіх купцоў. Прыехалі два немцы. Пахадзілі па парку, пастукалі кіёчкамі па дубах, памармыталі нешта і, пыхкаючы люлькамі, флегматычна заявілі, што яны не зацікаўленыя ў гэтых дубах. Хоць дубы вельмі прыгожыя, але мусілі быць сьсечаныя пяцьсот ці сямсот гадоў таму, а цяпер ня маюць ніякага рынкавага кошту, хіба што годныя на паліва.

Незалежна ад думкі нямецкіх прафэсіяналаў, з гэтых раковіцкіх дубоў былі вырабленыя так званыя планксоны (матэрыял, што выкарыстоўваецца падчас будаўнцтва караблёў) і паркет (які мо да гэтай пары ўпрыгожвае берасьцейскія будынкі 30-х гадоў, — **А.Г.**). Пры гэтым я сутыкнуўся зь дзіўным талентам палескіх дрывасекаў. Найперш гэтыя людзі не захацелі пасяліцца ў хатах зь печкамі, аддаўшы перавагу шалашам у парку, якія самі збудавалі з дубовага гальля. Грэліся яны тым, што трымалі ногі, абутыя ў лапці, у гарачым попеле. Харчаваліся ў асноўным салам і гарэлкай, але, тым ня менш, кожны самы вялікі дуб маглі спусьціць у любым кірунку, каб ён ламаў як мага меней суседніх дрэваў. Самі дубы часалі сякерамі зь лязом паўмэтровае даўжыні з такой дакладнасьцю, што стружкі выходзілі тонкія, нібы з-пад габёлка. Усё бервяно з васьмікутовым сячэньнем выходзіла з-пад сякеры, нібыта абгабляванае станком. Пры гэтым яны пасьля немалой чаркі дэманстравалі мне неверагодныя рэчы: клалі раскрытую левую далонь на сьвежасьсечаны пень і з усяе сілы з размахам секлі між расстаўленымі пальцамі, але не калечыліся пры гэтым.

Для вывазу гэтых вялізных дубовых брусоў на чыгуначную станцыю былі нанятыя спэцыяльныя фурманы — галяндцы з ваколіцаў Дамачава. Яны з такім самым майстэрствам, як і дрывасекі-палешукі, грузілі гэтыя вялізныя цяжары на спэцыяльныя вазы і ў пяць-шэсьць коней давозілі іх да чыгункі.

Раковіцкі парк пасьля гэтай вымушанай апэрацыі выглядаў як могілкі, а наш сямейны фальварак, вядома, прыгажэйшы ня стаў. Я пачуваўся фурманам катафалку. Цяпер я суцяшаюся тым, што, веравогодна, некалькі тых самых прыгожых дрэваў, якія я пакінуў на памяць, ужо сьсеклі дарагія суседзі-сяляне, цяперашнія члены раковіцкага калгасу. Але «ня час шкадаваць ружы, калі гараць лясы…»

Гэтыя словы былі напісаныя 60 гадоў таму чалавекам, які Раковіцы прысьвяціў усё жыцьцё. І напаўразбураная капліца на фамільных кладах, і рыбныя сажалкі ў Раковіцы, якімі карыстаюцца да гэтай пары, і рэшткі парку, цяпер амаль зьнішчанага, — гэта ўсё сьляды дзейнасьці Тэадора Талочкі. Спынімся і азірнёмся. Для таго каб стварацьь, ня так многа трэба: здаровы сэнс і чалавечае жаданьне.

Куды падзеліся скарбы Скокаў

Юльян Урсын Нямцэвіч, пісьменьнік, ад'ютант Тадэвуша Касьцюшкі, адзін з аўтараў першай Канстытуцыі ў Эўропе, нарадзіўся «дня 16 лютага году 1758 у Марцэля Урсына Нямцэвіча і Ядзьвігі з Сухадольскіх у Скоках над рэчкай Лясной у ваяводзтве Брэст-Літоўскім». На месцы, дзе стаяў той драўляны дворык, ацалела цагляная калёна, пастаўленая бацькам Юльяна («НН» №13, 2003). Пазьней Марцэль пабудаваў для сваёй вялікай сям'і палац. Той Скокаўскі палац — адзіны ацалелы гістарычны будынак такога кшталту ў ваколіцах Берасьця. Як гэта ні крыўдна для тысячагадовага гораду.

Марцэль будаваў палац з разьлікам на тое, што яго сыны Ян і Каэтан будуць жыць у ім зь сем'ямі. Адсюль строгая люстэркавая сымэтрыя пляніроўкі. Вялікая колькасьць малых скляпенных пакояў патрэбна была для неабходнага падзелу паміж дзьвюма сем'ямі. Юльян з «абоймы» выпаў: не пагадзіўся з намерамі бацькі ажаніць яго з багатай дзяўчынай.

Да сёньня на другім паверсе палацу захавалася «скарбніца». Там да першай сусьветнай вайны трымалі архіў Нямцэвічаў, фамільныя каштоўнасьці. Гэты скляпеністы пакойчык быў сьведкам апошняга падзелу між братамі Янам і Каэтанам: грошы і дыямэнты высыпалі на падлогу і расклалі пароўну. У пакоі за сьнедальнай заляй на першым паверсе зазвычай начаваў Тадэвуш Касьцюшка, калі заяжджаў да сваіх далёкіх сваякоў Нямцэвічаў.

Апошні ўладар палацу ў Скоках Станіслаў Урсын Нямцэвіч у сваіх успамінах «Маім унукам» падае дагэтуль невядомыя зьвесткі аб дэталях унутранага ўбраньня палацу. Салёны партэру мелі цудоўныя паркеты. Яны, праўда, сапсаваныя пазьнейшым пакрыцьцём, але захаваліся і маюць шанец быць рэканструяванымі. У салёнах меліся й малюнкі вядомых майстроў таго часу: Фра Барталямэо «Маці Божая з Ісусам у ружах», Ван Дэйка, Тэрнэрса і інш. У залі было шмат рэчаў з крышталю ў срэбнай і бронзавай аправе. Куды падзеліся каштоўнасьці Скокаўскага палацу?

У жніўні 1915 г., згодна з указам расейскага імпэратара, тую мясцовасьць мусілі пакінуць усе. Прымусовае бежанства — гэта надзвычай катастрафічная старонка гісторыі нашага краю, аб чым рэдка ўспамінаюць. Скокаўскі палац, як і многія будынкі ў горадзе і крэпасьці, мусіў быць зьнішчаны. Выратавала яго Зоф'я Мазарака, жонка Яна Урсына Нямцэвіча, які ў 1920—30-я будзе прэзыдэнтам Берасьця. Калі ўжо немцы былі ў крэпасьці, Зоф'я ў камандзіра казацкай дывізіі здолела атрымаць «слова гонару», што іх палац у Скоках ня будзе ўзарваны. Так «слова гонару» аднаго чалавека выратоўвае ад зьнішчэньня гістарычны аб'ект, а маўчаньне й абыякавасьць іншых губяць справу. Фантастычны прыклад!

Скокаўскі палац — найстарэйшы ацалелы гістарычны будынак у ваколіцах Берасьця. Там спыняўся Тадэвуш Касьцюшка, там у першую сусьветную жыў прынц Баварскі Леапольд, там у 1918 г. рыхтаваўся Берасьцейскі мір. Палац упрыгожвалі карціны ван Дэйка й Тэрнэрса. Выкладчык Берасьцейскага тэхнічнага ўнівэрсытэту і краязнаўца Анатоль Гладышчук адсочвае лёс каштоўнасьцяў, што захоўваліся ў палацы і зьніклі ў XX ст.

Будынак у Скоках аблюбаваў пад рэзыдэнцыю баварскі прынц Леапольд, камандуючы Ўсходнім фронтам. Як вынікае з мэмуараў міністра замежных спраў Аўстра-Вугоршчыны, «маленькі замак» быў месцам неафіцыйных сустрэч розных афіцыйных асоб, якія рыхтавалі Берасьцейскі мір. Перад адыходам немцы цалкам абрабавалі палац. Пры прынцу служылі людзі адукаваныя, якія добра ведалі, што чаго каштуе. Таму ёсьць шанец, што якіясьці рэчы Юльяна Урсына Нямцэвіча могуць знаходзіцца ў прыватных калекцыях нашчадкаў тых Леапольдавых афіцэраў.

Напярэдадні 1914 г. у Скокаўскім палацы пабываў дасьледчык Аляксандар Краўсхар, які працаваў у бібліятэцы і ў фамільным архіве Нямцэвічаў. Ён і зрабіў пералік і апісаньне рэчаў, што мелі наўпростае дачыненьне да Юльяна. Асабліва Краўсхара цікавілі аўтографы, якія пралівалі сьвятло на адносіны Юльяна Урсына Нямцэвіча з знакамітымі сучасьнікамі — Талейранам, Сапегам, Чартарыйскім, быў у архіве і ліст ад Джорджа Вашынгтона, напісаны 18 чэрвеня 1798 г. Дасьледчык згадвае каштоўную калекцыю табакерак, якія Юльяну дарылі расейскі цар Павал I, Напалеон, той жа Вашынгтон, Томас Джэфэрсан і інш. Ці вернуцца некалі гэтыя памяткі на радзіму? І Скокаўскі палац, і ўсё, што ў ім захоўвалася, — нацыянальная спадчына. Варта было б дадаць ягоныя скарбы да сьпісу тых каштоўнасьцяў, якія варта расшукаць у сьвеце і вярнуць на бацькаўшчыну.

Аўтар вельмі ўдзячны Вітальду Урсыну Нямцэвічу за грунтоўную дапамогу пры падрыхтоўцы артыкулу.

Старонку падрыхтаваў Анатоль Гладышчук, Берасьце

30 сакавіка 2004 г. былі падведзены вынікі штогадовага рэспубліканскага літаратурнага конкурсу для школьнікаў «Я маю твор...», што праводзіцца ў рамах акцыі «Дзень Зямлі». У конкурсе ўзялі ўдзел больш за дзьве тысячы аўтараў. 19 фіналістаў запрошаны ў Менск, дзе 22—24 красавіка адбудуцца майстар-клясы, выступы й узнагароджаньне пераможцаў. Зьмяшчаем тут вершы фіналістаў.

Андрэй Хадановіч

Арцём АЛАДКА

Лімоннае лета

Ў пачатку была ў мяне сьветлая мэта —
Знайсьці сярод скарбаў радзімы сваёй
Лімоннае лета, лімоннае лета
З прыгожаю, сьвежай яго цеплынёй.

Блакітная хваля праменьнем сагрэта,
Ды шчырую праўду ў душу мне ліе
Лімоннае лета, лімоннае лета...
Вось чайка аб белым дзяцінстве пяе.

Зялёныя вочы — азёры паэта —
Шукаюць апошнюю кроплю таго
Лімоннага лета, лімоннага лета,
Што не шкадавала каханьня свайго.

в.Бараўляны Менскага р-ну

Яраслава АНАНКА

* * *

Мы гэту крэпасьць
зваюем боем.
Ты чуеш, любы, —
бяз страт і болю.
Мы гэты вечар
распнём на ростань.
Даволі жвава.
Да сьмеху проста.
Мы размалюем
сьцяну на зоны.
І ў кожнай зоне
па парасоне.
Мы будзем шчасьцем
разводзіць плёткі.
Гадзіны разам
на кадры фоткаць.
Ты потым тыдзень
праходзіш хворы.
Бывай, каханы.
Я еду ў мора.

г.Чэрвень

Алеся БАШАРЫМАВА

Прыкуты

Што ж застыў ты у нябёсах?
Сьнег асеў на крылах...
І табе ня тыя словы
Восень гаварыла.
Гаварыла: «Тут ня страшна,
Заставайся, дружа!»
Потым вецер зьнёс апошні
Пах зьляцелай ружы.
Потым дождж прабіў свой холад
Ў пер'е і пад скуру,
Ну а потым сьнег — выстава
Нэархітэктуры.
Толькі ўсё ж ты засьпяваеш
Новаю вясною,
Бо нашто ж тады рабіўся
Карабельчык Ноеў?

г.Магілёў

Мікалай ВАЛЫНЕЦ

Я саромеюся

Я саромеюся.
Саромеюся пагляду твайго,
Пяшчотнага і ласкавага.
Я саромеюся.
Саромеюся званка твайго,
Здаецца, гучнага самага.
Я саромеюся.
Саромеюся сэрца свайго,
Якое так здольна кахаць.
Саромеюся шчасьця свайго,
Якое хачу спазнаць.
Я саромеюся.
Саромеюся сустрэцца паглядам
З вачыма тваімі сінімі.
І слоў, што з вуснаў тваіх зьляцяць
Пяшчотнымі і шчасьлівымі.

г.Вялейка

Людміла КАВАЛЁВА

* * *

Быў анёлам,
Ды болей ня мушу:
Адсеклі крылы,
Спалілі душу.
А попел разьвеялі
Па-над полем,
Дзе жыта пасеялі.
І таполі.
А ў тых таполях
Блукае вецер,
Сьпявае песьні
Пра ўсё на сьвеце,
Пра тое, што нельга
Зьявіцца каханьню,
Калі душу
Вядуць ў катавальню.

г.Гомель

Аля КІТАЁВА

* * *

Яно нарадзілася тыдзень таму.
Глытала паветра нясьмела,
Спыняла прышласьці хаду.
А потым, як лісьце, зьляцела.

* * *

ты пральешся
кіслотным дажджом
на паверхню
майго сьвету
пажывеш у маім
вымярэньні
і забудзеш
пра гэта здарэньне

г.Ворша

Соф'я МАРОЗАВА

Пра Любоў

Між суцэльнага дажджу
Так бывае цёмна, прыкра так!
Ці ня чуеш праз імжу
Моцна сьцятай душы скрыгату?

Захліпаецца жаль, крык,
Увесь працяты слязьмі позьнімі,
Бо любоў — гэта тып хандры,
А хандра — гэта тып восені.

Плязма часу паўзе ўглыб.
Восень пухне сьняжком мякенькім.
Суцішае мароз усхліп,
Пульхны сьвежанькі дзень зьвякае,

Разбурае сабой іржу,
Крэсьліць зьмены і адрозьненьні...
Але ж сьнег — гэта тып дажджу,
А вясна — гэта тып восені.

Праз хмурыначкі вось-вось
Патыхае зямля вільгацьцю.
Промень сочыцца наскрозь,
Камень лашчыцца пушыстасьцю

І вуркочыць, сьнючы сны...
Сьвежай хвояй цьвітуць сосен пні...
Так. Любоў — гэта тып Вясны,
А Вясна — гэта тып Восені.

пас.Міханавічы Менскага р-ну

Надзея ПЯТРУШЫНА

* * *

Боль — гэта смак тупога ляза
Гэта сьлёзны выклік спакою
Боль пра многае можа сказаць
Ці моўчкі разьліцца ракою

Той, хто згубу ў сабе трымае,
Бяз болю ня будзе пачуты
Філязофія болю такая:
Ўсё адносна праз прызму пакуты

г.Менск

Алена СЬЛІВІНСКАЯ

Плач

Мне здаецца
сівыя анёлы
плачуць
дзесьці высока
ў нябёсах
аб тваіх зьнявечаных лёсах
і лясах
і аб дзецях нягеглых
і кідаюць ім промні
надзеі
апошняй
і яшчэ спадзяюцца
убачыць зьнянацку
абялелую Русь
ў крывіцкіх абдымках
і вярнуцца
шызымі
аблокамі зь неба

толькі дзесь заблукалі
крывіцкія душы
і аглухлі
ад шматвечнай пагоні
і асьлеплі
ад крыві крывіцкай
і сьцішэлі, апалі ў гоні
«без надзеі спадзеючыся»

Час!
калі дакрычацца няможна
ужо надышоў
тваіх трубаў
БОЖА
чакаеш
чакаюць
каб з калішніх калень
узьняцца
і на раньні ўкленчыўшы небу
і пазбыўшыся спадчын суседзяў
паляцець
да Новай Зямлі
дзе даўно
душою
прадзеды
узраслі камянямі
на ўзьмежжах.

в.Чырвоныя Швабы
Лагойскага р-ну

Ася ЯРМОЛЕНКА

Дзевяць пацалункаў

Я іду па начной вуліцы й чую каханьне:
Яно ў гуле хворых правадоў,
Што выбіваюць іскры;
Яно ў крыку чаек,
Зьведзеным да шаленства ад жаданьня Палёту;
Яно ў вуснах начнога ветру,
Які кранае сваімі вуснамі мае й кудлаціць
мае валасы сваёю зорнаю рукой бяз сораму,
Што яму больш за мільярд гадоў,
А мне хутка будзе 16...

...Зоркі зьвязаныя паміж сабой белымі
ад гарачыні ніткамі й зьвіняць,
Іграючы Транс каханьня...
Падэшвы маіх туфляў цалуюць мокры залаты асфальт:
9 пацалункаў —
9 крокаў да цябе,
Каханьне!

в.Вязьзе Асіповіцкага р-ну

Шмат ведзьмаў у Беларусі

— Глядзі, нікому не прагаварыся, што мы пойдзем па справах, — папярэдзіў бацька сына.
— А то нячысьцікі пойдуць за намі і як-небудзь, ды нашкодзяць. Многія ведзьмакі нядобра глядзяць на тых, хто займаецца гандлем.
Заменга Батукезанга, «Успаміны аб вёсцы». Літаратурны альманах «Афрыка», выпуск №7.

Астралягічны цэнтар праводзіць сэансы яснабачаньня, зьняцьця псоты, аднаўленьня ўзаемаадносін у сям'і, посьпеху ў бізнэсе.
Газэта «Из рук в руки», Менск, 27 сакавіка 2004 г.

Калісьці ў школе на занятках гісторыі нам распавядалі, нібыта прычынаю веры ў нячысьцікаў і ведзьмакоў зьяўлялася безабаронасьць старажытнага чалавека перад навакольным сьветам.

У наш час, на жаль, забабоны не зьнікаюць. Наадварот, зьяўляюцца новыя. Больш за тое, на кожным слупе ці нават у СМІ нескладана знайсьці абвестку: «Варажу на картах. Здымаю псоту. Нядорага». І справа тут ня столькі ў вялікай колькасьці падобных аб'яў, колькі ў наяўнасьці попыту на такія паслугі.

У канцы 80-х усе баяліся радыяцыі.Тут жа знайшлася Хадора з-пад Бялыніч. Малапісьменная, але прадпрымальная бабка тлуміла галовы ня горай за Кашпіроўскага, прапаноўваючы лячыцца ад радыяцыі глінаю зь ейнага калодзежа. Мінуўся час. З радыяцыяй усе звыкліся. А словазлучэньне «Хадора Бялыніцкая» ператварылася ў крылаты выраз, які азначае тое самае, што й «пута калгасная».

Дарэмна сацыялягічныя апытаньні пераконваюць у стабільнасьці ды ўпэўненасьці беларусаў у заўтрашнім дні. Небеспадстаўны страх перад навакольным сьветам моцна сядзіць у нашай сьвядомасьці.Чым болей жыцьцё чалавека залежыць ад знадворных абставін, а не ад яго асабіста, тым болей прымхлівасьці. Хочаш даведацца, чаго баіцца наш сучасьнік-суайчыньнік, — прыгледзься ўважліва да існых забабонаў — старых і тых, што толькі ўзьніклі.

Што да прыкмет накшталт «Марозная зіма — сьпякотнае лета», цяпер мала хто адважыцца сказаць такое ў кампаніі заўзятых дачнікаў. Перамяшалася ўсё ў прыродзе.

Магічныя спосабы ратунку ад навальнічнай небясьпекі цікавыя толькі старым з далёкіх вёсак.

У асноўным людзі жахаюцца няшчасьцяў, прадухіліць якія ня маюць магчымасьцяў, а грамнічнаю сьвечкай ад такога не ўратуешся. Самыя пашыраныя, вядомыя кожнаму прымхі датычаць хваробаў, часьцей невылечных, небяспечных здарэньняў у дарозе, нараджэньня хворых дзяцей, вядзьмачых чараў, матэрыяльнага дабрабыту, на вёсцы — здароўя быдла.

Каб грошы вяліся

Парадаў наконт гэтага багата. Спадабаецца камусьці тваё працоўнае месца або ў аўтобусе абрабуюць — паверыш у што хочаш. Кожны ведае: нельга на стол пустую пляшку ставіць, сьвістаць у кватэры, насупроць ночы пакідаць нож на стале і выносіць сьмецьце, у вялікія сьвяты ды нядзелі пазычаць грошы людзям, гэтаксама як і пазычаць у людзей. Камечыць грошы, абыходзіцца з грашовымі знакамі неахайна забараняецца: пакрыўдзяцца.

Трэба роўненька складаць грошыкі, захоўваць паперкі ад пачкаў з грашыма. Каб гандаль быў удалы, грошы, атрыманыя ад першага продажу, па магчымасьці захоўваць да заканчэньня гандлёвага дня, а не распускаць на рэшту.

Дабрабыт — зьява ненадзейная, калі ня маеш заступнікаў пры пасадзе ці багатай спадчыны.

Няблізкі сьвет

Словазлучэньне «сабраўся ў дарогу» само празь сябе тоіць небясьпеку. Калі старыя прамаўляюць: «Гэта дарога», — то маюць на ўвазе: любое падарожжа непрадказальнае, таму варта ў дарозе быць пільным і падрыхтаваццa як сьлед. Прысесьці на дарожку, пакідаючы хату, паставіць дагары вілкі, тройчы прагаварыўшы «Шчасьлівай дарогі!». Ні ў якім разе не паведамляць нядобразычліўцам пра мэту й час свайго падарожжа. Няблага ўзяць з сабою перапісаны тэкст замовы «Сон Божай маці».

У гарадзкой кватэры вілак няма, у вёсцы іх яшчэ ставяць на ўдалую дарогу. Замову ведае мала хто, затое ў кабіне кожнага транспартнага сродку вісіць абразок. Ня ўбачыўшы яго, пасажыры робяць заўвагу кіроўцу. Не баіцёся дарогі — гэта часова. Паслухайце зводкі ДАІ, прыгадайце тых, хто з заробкаў не вярнуўся.

Абы здаровейка...

Час уносіць свае карэктывы. Замовы ад рожы ды бародавак патрэбныя толькі фалькларыстам. Людзі баяцца анкалягічных хвароб. І тут ужо забабоны ператвараюцца ў цьвёрдыя перакананьні. Рак пераходзіць зь мёртвага на жывога. Калі прычына сьмерці — анкалягічная хвароба, трэба хаваць як мага хутчэй, на могілках непажадана разьвітвацца зь нябожчыкам, як звычайна, — сам захваразеш. На жаль, ніводнага разу ня чула ад адмысловцаў ані пацьверджаньня, ані абвяржэньня калектыўнай думкі. Найлепшыя лекі ад раку, згодна з сучаснымі забабонамі, — грыб вясёлка, настойка мухамора. Надзея памірае апошняй.

Пагражае стратаю жыцьця й здароўя праца ў вялікія царкоўныя сьвяты. У любой вёсцы ці горадзе распавядуць, як нехта на Вялікдзень рамантаваў машыну і атруціўся газам або працаваў на гародзе і зламаў нагу. На ўсялякі выпадак непажадана працаваць на абодва Вялікадні. Нельга шыць у калядныя вечары. Новае шыць — яшчэ куды ні йшло, а зашываць старое — крый божа. Народзіцца дзіця з зашытымі вантробамі ці такая ж жывёліна на падворку. Усё ж такі давялося пастроіць якуюсь апранаху ў сьвяты вечар? На Хрышчэньне вазьміце анучу, зрабіце два-тры швы і спаліце на агні. Шкодна можа адбіцца на здароўі дзіцяці ня толькі шыцьцё на Каляды. Сучасныя забабоны забараняюць цяжарнай стрыгчы валасы, закрываць твар рукамі пры пажары, нядобра, як котка аб босыя ногі лашчыцца.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Каб жывёла не прападала

Карысна пахадзіць у калядная чарадзе: перакупіш у Бога жывёлу — хварэць ня будзе. Замовы на лячэньне чорна-рабой, чорна-чырвонай кароўкі памятаюць толькі старыя. Але ў тым, што вужака п'е малако ў каровы, а ласка можа заказытаць быдла, перакананы нават даволі адукаваныя людзі сярэдняга веку.

Няхай з вачэй кроў пацячэ...

Ад вядзьмачых чараў і суроку ўсе нягоды — сьмерць, хваробы, п'янства, разлад у сям'і. Таму ведзьмаў ды кепскіх вачэй баяцца як вясковыя бабулі, так і гарадзкія ўнукі. Ладная частка нашых людзей схільная тлумачыць свае хранічныя жыцьцёвыя няўдачы словамі «Мне нешта зроблена». Калі нехта вінаваты — на сэрцы лягчэй. Нават у канцы XX ст. на вёсцы абраза «ведзьма» лічылася больш крыўднай, чым «паліцай».

«Хто ўрачэ, таму няхай кроў з вачэй пацячэ».

«Хто падзівіцца — няхай з жопы пажывіцца».

Пераконваюць словы старой замовы ў небясьпецы кепскіх вачэй ды спрадвечнай памяркоўнасьці беларусаў. Апроч замовы, ёсьць яшчэ адзін сродак ад суроку. Калі нехта глядзіць утаропіўшыся — зацісьні дулю ў кішэні і прамаўляй цішком: «Соль табе ў вочы, дзяркач у сраку». Зьявілася й новая прымха — прышпільваць да адзежы крамную шпільку, каб не сурочылі.

Асабліва зручна ведзьме рабіць чары на знакавых для кожнага падзеях — накшталт вясельляў, пахаваньняў. Дзейсна і шмат людзей закранае. Вядзьмачка можа дарогу труне перабегчы, скрасьці іголку, якой падушку для нябожчыка шылі, пасыпаць капеек на палас. Дый ці мала што яшчэ!

Убачыўшы на падворку незнаёмыя, чужыя рэчы, купкі чорнага пяску на ганку, не пакідайце гэта па-за ўвагай. Зьбярыце ўсё і выкіньце далей ад сядзібы — толькі так, каб рукамі не дакранацца, найлепш нейкім старым дзеркачом і шуфлікам, каб пазбыцца і іх. Шкоду чалавеку найлепш на салодкім зрабіць можна. Калі ваш нядобразычлівец пазычае ў вас цукар аб 11-й гадзіне вечару альбо рэгулярна й настойліва спрабуе пачаставаць вашых дзяцей прысмакамі — будзьце пільныя. Выкіньце такія гасьцінцы пад ягоную прызбу, сказаўшы тройчы: «Што рабілі нам, няхай будзе вам». Не хадзіце на бяседы да ведзьмакоў, тым больш калі прымушаюць ісьці і толькі вашу сям'ю клічуць. Няможна адмовіць — меней ежце ў гасьцях.

Дзіўна: мы ведаем усе прымхі, як быць заможнымі, здаровымі, шчасьлівымі, — а жыцьцё да лепшага ня йдзе. Як шмат ведзьмаў у Беларусі!

Тацяна Барысік, Магілёў

• ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

Запрашаем на падарожжа **2 траўня** (нядзеля) па маршруце **Менск — Ішкалдзь — Сынкавічы — Жыровічы — Слонім — Ружаны — Косава — Менск.**
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16 рэклямныя расцэнкі: да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.

ВІТАНЬНІ

Вітаем кардынала Казімера Сьвёнтака з 65-годзьдзем сьвятарскага пасьвячэньня ў Беларусі. Бережы Вас Бог!

Паважаны Зянон Станіслававіч! Віншуем зь Юбілеем. Жадаем посьпехаў ва ўсіх Вашых справах на карысьць Бацькаўшчыны. Сябры Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі — БНФ

Зянона Пазьняка віншуе зь юбілеем Партызанская Рада Кансэрватыўна-Хрысьціянскае Партыі — БНФ. Ваш шлях, асьвечаны сілаю праўды і любові да Бацькаўшчыны, непазьбежна стане пераможным

Зянону Пазьняку, чалавеку, які ўзьняў сьцяг адраджэньня нашае Бацькаўшчыны, бясконцая падзяка беларусаў

Зянона Станіслававіча Пазьняка віншуе Кальварыйская арганізацыя Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і жадае хуткага зьдзяйсненьня Вашых мар. Спадзяемся на Божую ласку, што дасьць Вам моцнае здароўе на доўгія гады і хутчэйшую сустрэчу з Вамі на вольнай Радзіме

Шчыра віншуем Зянона Пазьняка зь юбілеем! Беларусы шчасьлівыя ўжо ў тым, што маюць Вас сваім сучасьнікам, шчырага Беларуса, Чалавека геніяльнага розуму, чыстага душой і памкненьнямі. Група сяброў БНФ «Адраджэньне» зь Менску

Шчыра дзякую Алесю Зарамбюку за падтрымку. Кастусь К.

Віншуем трансвэстытку Анфісу зь перамогай у міжнародным конкурсе. Ігар

КНІГІ

Кнігі — поштай. Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050 Менск, e-mail: exlibris@tut.by, Internet: http://www.knihi.net, тэлефон: (8-029) 643-57-33

Кнігі — поштай. Новыя: Альгірдас Ю. Грэймас «Пра багоў і людзей. У пошуках этнічнай памяці», Сяргей Ёрш «Рыцар Свабоды» (Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі як ідэоляг і арганізатар беларускага нацыянальнага антынацысцкага супраціву), Міхась Раманюк «Беларускія народныя строі», Яўген Мірановіч «Найноўшая гісторыя Беларусі», Сяргей Абламейка «Еґоізмы. Канстатацыі», Беларуская міталёгія (Энцыкляпэдычны слоўнік), Адам Глёбус «Дом». Т.: (8-029) 643-57-33, exlibris@tut.by

МЯНЯЮ

Мяняю апошнія нумары сіламоц навязанай мне газэты «ЛіМ» на нармалёвую туалетную падшрачную паперу (парытэт абмену: адзін нумар газэты — адзін рулён паперы). Пісчай паперы не прапаноўваць, толькі падшрачную. Кантакт праз рэдакцыю газэты «ЛіМ», прасіць на дрот Васіля Сёмуху

ПРАЦА

На заказ зраблю і выдам вам асабістую кнігу ці іншае выданьне. Т.: 687-69-52

Шукаю працу юрыста. Валянціна. Т.: 259-97-80

КАЦЯНЯ

Аддам кацяня ў добрыя рукі. Т.: 287-59-31. Варвара

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

Наступны нумар газэты выйдзе **7 траўня.** У Менску ў продажы — з абеду 6 траўня.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
фота-рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 30152120000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3526. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 21.04.2004.
Замова № 2359.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а